PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 13 (2445) Год XLVIII | Беласток, 30 сакавіка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

## Непазбежны Еўрасаюз

Мацей Халадоўскі

Падляшскія самаўрады ў Еўропе. Дзеянні. Чаканні. Небяспекі — пад такім лозугнам праводзілася ў Беластоку канферэнцыя прысвечаная ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз і карысцям, якія з гэтага факту адчуюць жыхары ваяводства.

Канферэнцыю арганізавала Падляшская маршалкоўская ўправа пры саўдзеле ваяводскай. Прынялі ў ёй удзел перш за ўсё прадстаўнікі гмінных і павятовых самаўрадаў. Ганаровым госцем быў міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, які дзень да беластоцкай сустрэчы аб еўрасаюзных справах размаўляў у Берліне, а два дні пасля — у Парыжы. Канферэнцыю, як належыцца, адкрыў гімн ЕС „Да радасці", адспяваны хорам Вышэйшай эканамічнай школы і выслуханы ўдзельнікамі стоячы. Перад чаканым выступленнем міністра Цімашэвіча інфармацыямі аб перадуваходнай рэчаіснасці на Падляшшы падзяліўся ваявода Марэк Стшалінскі. Не скрываў ён гонару ад таго, што ўжо сем малочных прадпрыемстваў з нашага рэгіёна выконваюць усе еўрасаюзныя патрабаванні і маюць права на экспартаванне сваіх вырабаў у краіны Еўрасаюза. Падобныя крытэрыі спаўняюць два прадпрыемствы вырабу чырвонага мяса і па адным птушкаапрацоўчым і рыбным. У чарговых пяці малочных прадпрыемстваў ёсць такі шанц. Пры нагодзе выявілася, што на Падляшшы ўжо 95% быдла закальцавалі. У сваю чаргу прыярытэт ваяводскіх улад год да праўдападобнага ўваходу — разбудова і мадэрнізацыя пагранперахода ў Кузніцы, завяршэнне якога плануецца на наступны год. Ваяводская ўправа падрыхтавала свайго роду падручнік, *Spójność społeczno-gospodarcza w województwie podlaskim*, які мае палегчыць вызначэнне абшараў, якім патрэбная еўрасаюзная падтрымка.

Міністр Цімашэвіч заявіў, што пасля падпісання ўваходнага трактата 16 красавіка ў Афінах Польшча будзе г.зв. актыўным назіральнікам, значыць, польскія прадстаўнікі будуць прысутныя ва ўсіх еўрасаюзных структурах.

— Гэта будзе своеасаблівая зарадка перад паўнапраўным уваходам, — дадаў. — Будзем мець магчымасць уплываць на дзеянні паасобных дзяржаў усяе пашыранае Еўропы, напрыклад, наконт усходняй палітыкі.

Шэф польскага МЗС пры нагодзе спаслаўся на сённяшнюю і будучую палітыку ЕС і Польшчы ў адносінах да Беларусі:

— Прапануем вялікую адкрытасць да Беларусі, адкрытасць на эканамічнае і грамадскае супрацоўніцтва.

Назваў тут м.інш. патрэбу польска-

[працяг ☞ 3]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Мы выйдзем шчыльнымі радамі...

## З верай у беларускую перамогу

У гэтым годзе адзначаць Дзень Волі беларускія дзеячы сабраліся ў больш прасторным памяшканні, чым у мінулых гадах. У нядзелю, 23 сакавіка, у беластоцкую кавярню „Фама" прыйшло пад дзвесце чалавек рознага ўзросту — з перавагай дзеячаў сярэдняга пакалення. Згуртавала іх ідэя назалежнасці Беларусі, якой сімвалам з'яўляецца 25 Сакавіка — дзень абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. На жаль, гэтае свята не прызнаецца афіцыйнымі ўладамі Беларусі, якія, так сама як за савецкім часам, лічаць яго святам нацыяналістаў, абвінавачваючы іх пры тым у распальванні міжнацыянальнай варожасці. Дзень Волі ў Беларусі святкуюць толькі дэмакратычныя апазіцыйныя арганізацыі, а ў замежжы, асабліва далёкім, заходнім — беларускія эміграцыйныя суполкі. Тыя, што аспрэчваюць значэнне Акту 25 Сакавіка, не хочуць зразумець, што калі б не было Беларускай Народнай Рэспублікі, не было б і альтэрнатыўнай ёй бальшавіцкай Беларускай Савецкай Сацыялістыцкай Рэспублікі, і цяперашняй Рэспублікі Беларусь, кіраўніцтва якой ад некалькіх гадоў нанава інтэгруецца з Расіяй у новы саюз. А гэта пагражае стратай суверэнітэту і канчатковым растварэннем беларушчыны ў расійскай стыхіі.

Беластоцкае святкаванне 25 Сакавіка, якое сарганізаваў Беларускі саюз у Рэчы Паспалітай, пачалося з гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" і зачытання віншаванняў ад беларускіх арганізацый з Беларусі, Латвіі, Амерыкі і Аўстраліі. Старшыня Беларускага саюза Яўген Вапа прыгадаў вытокі свята і яго значэнне для нашай грамадскасці. Урачыстасць сталася добрай нагодай для ўшанавання дзеячаў за іх працу ў карысць беларускай справы. Сёлета вылучаны былі тры асобы: Віктар Швед, паэт, які ў гэты дзень адзначаў 78-годдзе з дня нараджэння, Аліна Ваўранюк, настаўніца беларускай мовы з Беластока — за адукацыйныя дасягненні і Міхась Андрасюк з Гайнаўкі — за самаўрадавую дзейнасць. Затым юбіляр прачытаў два свае вершы — „Малітва" ды „Адраджэнцы і адрачэнцы". Афіцыйную частку мерапрыемства завяршылі гістарычныя рэфлексіі д-ра Алега Латышонка.

Канцэртную частку ўрачыстага спаткання пачалі дашкольнікі з Самаўрадавага садка № 14 з Беластока, якіх падрыхтавалі Ева Гняздоўская, Данута Тымашэвіч і Анна Бабік. За імі на сцэну выйшлі вучні Аліны Ваўранюк з Пачатковай школы № 4 з Беластока. Пасля вучнёўскіх літаратурна-музычных мантажоў выступілі тры гурты: „Знічка" з Гайнаўкі, „Ріма" з Гарадка і „Маланка" з Бельска-Падляшскага.

25 Сакавіка — свята вольных людзей, якія вераць у перамогу ідэі самастойнасці Беларусі. Нам тут, на Падляшшы, апрача клопатаў за захаванне беларускай тоеснасці, важна таксама ці наша духовая Бацькаўшчына зойме трывалае месца ў сям'і вольных і самастойных дзяржаў свету, ці задаволіцца фіктыўным суверэнітэтам у чарговай саюзнай структуры. Сабраным на беластоцкіх святкаваннях Дня Волі хочацца верыць, што Беларусь будзе незалежнай, дэмакратычнай краінай, якой будуць ганарыцца беларусы на Радзіме і ў замежжы, што адраджэнцы перамогуць адрачэнцаў, аб якіх так вобразна выказаўся паэт.

Віталь Луба


### Адкрыццё Польшчы на Беларусь ☞ 3

Неабходна такое супрацоўніцтва, будаванне такіх кантактаў і еўрапейскіх праектаў, якія дадуць такі вынік, што ў грамадстве ў Беларусі будзе больш людзей адкрытых на свет, моцна матывіраваных для таго, каб стандарты Еўропы пераносіць у сваю краіну.

### Юбілей ☞ 3

І сабраліся, хто даў рады, на юбілей першага рэдактара Георгія Валкавыцкага, які спраўляла сабе „Ніва" (заадно і ўласнае саракасямігоддзе). „Ніва" нарадзілася 4 сакавіка, 1956 года, а Жорж — 13, але добры кавалак часу раней. Восемдзесят Георгію Валкавыцкаму, а хто скажа?

### Да ўгодкаў Францішка Аляхновіча ☞ 4

Аляхновіч на Салаўках прабываў да 1933 г. У рамках абмену палітычнымі вязнямі саветы аддалі яго палякам за Браніслава Тарашкевіча. У 1935 г. паказалася кніжка Аляхновіча *У кіпцюрох ГПУ* на польскай мове. Было гэта першае апісанне лёсаў зняволеных у сталінскіх канцлагерах.

### Пад знакам „белавежцаў" ☞ 6

Цэнтральныя элімінацыі IX выпуску Алімпіяды беларускай мовы праходзілі пад знакам творчасці „белавежцаў". Вучні найчасцей аналізавалі мініяцюры Сакрата Яновіча, паэзію Алеся Барскага і Віктара Шведа, пісалі пра паэзію Надзеі Артымовіч.

### Былі маладымі ☞ 10

Засерабрылася 25 лютага г.г. зала н-р 12 Гарадской управы ў Гайнаўцы. У гэты дзень праходзіў у ёй справаздачна-выбарчы з'езд Раённага аддзела Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў. Са справаздачы старшыні вынікала, што члены „саюза старэйшай моладзі", бо так сваю арганізацыю жартаўліва яны называюць, нягледзячы на пажылы ўзрост і марнае здароўе, дзейсна дапамагалі сябрам.

### Кленіцкія жывёлаводы ☞ 11

У спадарства Кобацаў ахвотна купляюць ялавак, бо можна спраўдзіць іх радаслоўе і даведацца колькі малака давалі яны і іх маткі на працягу многіх гадоў. Зараз статак 90% складаюць каровы гольштэйн-фрызійскай пароды. Для гаспадарчых патрэб прыдбалі чатыры трактары і машыны да ўборкі травы і загатоўкі сіласу.


9 770546 196000

# Беларусь — беларусы

## „Бясцэнныя” кнігі Лявона Вашко

Лёс канфіскаваных супрацоўнікамі Гродзенскай рэгіянальнай мытні кніжак беларускага празаіка з Мастоў Лявона Вашко дагэтуль невядомы ані аўтару, ані ягоным калегам, ані ўвішным журналістам. Аднак, ёсць „адказныя” асобы, якія бачылі што сталася з літаратурнымі выданнямі...

Выбіраючыся на леташні літаратурны семінар „Бязмежжа”, Лявон Вашко прыхапіў з сабой пару дзесяткаў асобнікаў уласнай друкаванай прадукцыі, каб падараваць калегам у Польшчы, але быў аператыўна „выкрыты” гродзенскімі мытнікамі як „кантрабандыст”. Мытнікі склалі адпаведныя паперы, маўляў, кнігі затрымліваюцца для экспертызы — „ці не пагражаюць яны дзяржаўнаму ладу і бяспецы Рэспублікі Беларусь”. Мінае ўжо чатыры месяцы з дня кур’ёзнага „інцыдэнту”, а вынікаў так званай экспертызы як не было, так і няма.

— Пра канфіскацыю маіх кніжак пакуль нічога не чуваць, і я з гэтае нагоды нават рады, — прызнаецца Лявон Вашко. — Паколькі цішыня лепей за дрэнныя навіны, — я не супраць, каб усё ўляглося.

Затое „эксперты” з Упраўлення інфармацыі і друку Гродзенскага аблвыканкама даволі хутка вырашылі лёс канфіскаванай яшчэ ўлетку мінулага года сціпленькай газеткі-ўлёткі „Эмігрант” — „выданне наносіць шкоду інтарэсам Рэспублікі Беларусь”.

Я разумею, кнігі Лявона Вашко — гэта не самапальная газетка, іх трэба ўважліва прачытаць, яны патрабуюць інтэлектуальнага высілку і спецыфічнай адукацыі, каб асэнсаваць і зразумець усю сутнасць. Таму „экспертыза” можа цягнуцца да бясконцасці. Я ўяўляю, як цэнзары качаюцца на канапах, чытаючы ў вольны ад асноўнай працы час аповесці і драмы Лявона Вашко, шукаючы ў іх заказаны начальствам „кампрамат”...

Дык які ж лёс напаткаў выданні мастоўскага пісьменніка? Гэтае пытанне я хацеў задаць начальніку Гродзенскай рэгіянальнай мытні і ягонаму намесніку падчас іхняга нядаўняга „бенефісу” ў прамым эфіры Тэлебачання Гродна. Але датэлефанавацца на працягу ўсёй перадачы было немагчыма. Тэлефоны занятыя. Няўжо больш як паўгадзіны бесперапынна сыпаўся такі шквал пытанняў? Якраз не — усе пытанні былі загадзя падрыхтаваныя, у тым ліку і ад імя тэлегледачоў! Бо інакш як растлумачыць працяглыя паўзы паміж пытаннем і адказамі, быццам цягнулі ката за хвост.

Давялося затэлефанаваць непасрэдна ў сядзібу мытнікаў. Іх шэфа не было, намеснік скантактаваў мяне з начальнікам мытнага кантролю Віктарам Урэевым, які на цудоўнай беларускай мове адказаў:

— Так, мне вядомы лёс выданняў Лявона Вашко. Але я не магу вам адказаць, што ўяўляе сабой большую небяспеку: зброя і наркотыкі ці мастацкая кніга. Шараговы мытнік не можа адказаць на такое пытанне, бо гэта не ў яго кампетэнцыі. Вам я не паведамлю, што сталася з кнігамі. Хай сам аўтар звернецца да нас, мы яму адкажам...

У чыёй жа кампетэнцыі знаходзіцца лёс выданняў Лявона Вашко? Калі яны мацнейшыя за наркотыкі, больш небяспечныя, чым хворыя на сіфіліс нелегалы ды зброя тэрарыстаў, больш каштоўныя, чым антыкварыят, дык тады мастоўскі пісьменнік — сапраўдны геній, а Беларусь першая сустрэне канец свету!

Юры Гумянюк

## Юбілей Валянціна Грыцкевіча

Старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу (Расія) Валянцін Грыцкевіч адзначае 70-гадовы юбілей. Гэты вядомы культуролаг, гісторык, лекар і грамадскі дзеяч нарадзіўся 30 сакавіка 1933 г. у Мінску ў сям’і настаўніка і лекара. Закончыў аддзяленне англійскай мовы (1955), медыцынскі (1956) і гістарычны (1957) факультэты. Працаваў вясковым лекарам, затым галоўным лекарам Рэспубліканскага супрацьвалляковага дыспансера ў Мінску, пасля пераехаў у Ленінград, дзе да 1971 г. таксама працаваў лекарам. У 1971-1995 гг. быў старшым навуковым супрацоўнікам Ваенна-медыцынскага музея ў Ленінградзе. Адначасна з 1980 г. выкладае гісторыю, а ў 1988 г. стаў дацэнтам кафедры музеязнаўства ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце культуры і мастацтваў. З 1963 г. з’яўляецца кандыдатам медыцынскіх навук.

Валянцін Грыцкевіч вядомы як аўтар кніг па гісторыі медыцыны, музейнай справы ў свеце і метадалогіі гісторыі, складальнік жыццяпісаў беларускай інтэлігенцыі ў замежжы і біяграфій медыкаў. Аўтар больш за 350 навуковых публікацый, удзельнік шэрагу міжнародных канферэнцый па гісторыі навукі і культуры. Адзін з арганізатараў у 1989 г. Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу і яго нязменны старшыня.

Юбіляр друкаваўся ў нашым тыднёвіку (у 1999 г. апублікаваў цыкл артыкулаў пад загалоўкам „Знішчэнне мовы”) і выступаў з навуковымі паведамленнямі ў Беластоцкім універсітэце. (вл)

## Новая сядзіба Генконсульства

Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку 31 сакавіка мяняе сваю сядзібу і перасяляецца ў новы будынак па вуліцы Электрычнай 9 (уезд ад вуліцы Варшаўскай).

Працоўны дзень Генконсульства і гадзіны прыёму наведвальнікаў не мяняюцца. Беларускае дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Беластоку працуе ад панядзелка да пятніцы (апрача серады) з 9.00 да 12.00 і з 13.00 да 15.30. Дэталёвыя інфармацыі можна атрымаць па тэлефоне: (085) 744 55 01, 744 63 28, тэл./факс (085) 744 66 61 і па электроннай пошце: konsulatblrbialystok@sitech.pl

Новы паштовы адрас: **Konsulat Generalny Republiki Białoruś w Białymstoku, 15-080 Białystok, ul. Elektryczna 9**.

## Напаўзабытае свята

Надыход вясны ў Беларусі шмат для каго ўжо асацыюецца з уздымам грамадска-палітычнай актыўнасці. Так насамрэч адбываецца ўжо некалькі гадоў запар. Сёлетняя вясна не стала выключэннем. Сярэдзіна сакавіка адзначылася трыма падзеямі без перабольшання агульнанацыянальнага маштаба. Але адна з іх — Дзень Канстытуцыі, дарэчы, дзяржаўнае свята, прыцягнула да сябе менш за ўсё ўвагі.

Але аб усім па парадку.

На 12 сакавіка была запланавана ўсерэспубліканская акцыя „За лепшае жыццё”. Падрыхтоўка да яе ішла даволі працяглы час. Да ўдзелу ў мерапрыемстве заклікалі апазіцыйныя палітыкі, лідэры партый, сябры разнастайных грамадскіх арганізацый. Сэнс акцыі даволі празаічны — прыцягнуць увагу як улад, так і ўсёй грамадскасці да пагаршэння ўмоў жыцця беларускага народа. Арганізатары падкрэслівалі, што найбольшая колькасць людзей хутчэй збярэцца пад сацыяльнымі лозунгамі, чым пад лозунгамі чыста палітычнымі. Якім ёсць, прынамсі, Дзень Волі 25 сакавіка. Але, як аказалася па выніках мерапрыемства, не ўсё на самой справе так. Асабліва, калі зважаць на той слой беларускага грамадства, што шчыра падтрымаў арганізатараў.

Марш „За лепшае жыццё” ў Мінску прайшоў мірна і спакойна — не было ні нейкіх пагромаў, перавернутых машын, бітых твараў і шкла. Але, тым не менш, арганізатары акцыі назаўтра апынуліся на лаўцы падсудных і атрымалі па 15 сутак арышту. Сярод чацвёркі асуджаных — былы дэпутат Вярхоўнага Савета XIII склікання Людміла Гразнова, якая за ўсё сваё жыццё знаходзілася ў судзе як вінаватая ўпершыню. Такі чыннік, на жаль, не збянтэжыў суддзю. Чаму так адбылося?

Асуджаныя арганізатары акцыі гавораць, што такія прысуды — сведчанне боязі ўлад перад хваляй пратэстаў, на якія хутка ўздымецца народ.

Хтосьці з вялікіх казаў, што найгоршы від падману — гэта самападман. Калі сярод жыхароў паўтарамільённага Мінска выказаць сваё незадавальненне ўнутранай палітыкай дзяржавы прыходзіць толькі (па розных ацэнках) 3-5 тысяч чалавек, то шлях да лепшага жыцця будзе вельмі доўгім. І вышэйзгаданы жорсткі судовы вырак ёсць толькі сведчаннем падаўлення іншадумства асобных персон.

Схіляючы галаву перад асуджанымі за свае думкі і погляды дэмакратамі, не перастаеш сумнявацца ў вартасці заклікаў да лепшага жыцця тых, каму даспадобы існуючы стан рэчаў. І калі паглядзець на падтрымку акцыі па краіне, то яскрава бачна дзейсная падтрымка яе толькі з боку прадпрымальнікаў. Гэты слой грамадства ўсё больш церпіць ад мацнеючай камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання, дзе няма месца прыватнай ініцыятыве. Што ж тычыцца тых жа рабочых, настаўнікаў, сялян, то ім, здаецца, жывецца не так ужо і цяжка, калі зважаць на іх абыякавасць да заклікаў апазіцыянераў. А калі ўлічыць вынікі нядаўніх выбараў у мясцовыя органы ўлады, то нешта змяняць у сваім жыцці большай часткі насельніцтва Беларусі ўвогуле не хочацца.

16 сакавіка ў Мінску прайшоў Усебеларускі сход інтэлігенцыі. Вялікая колькасць інтэлектуалаў з’ехалася з усёй краіны, каб, па сутнасці, паспрабаваць адказаць на пытанне „Што рабіць?” Прычым адказ на пытанне „Хто вінаваты?” застаўся недзе ў паветры, не ўвасобіўшыся ў прынятых сходам дакументах.

Сабраўшыеся інтэлігенты выказалі ўсё тое, пра што неаднаразова гаварылася на мітынгах і пікетах, у апазіцыйных газетах і ўлётках. Удзельнікі сходу, сярод іншага, заклікалі А. Лукашэнку пачаць дыялог з прадстаўнікамі ўсіх палітычных сіл грамадства, але пры гэтым выступілі супраць падаўжэння паўнамоцтваў цяперашняга кіраўніка Беларусі пасля 2006 года. Здаецца, будзе вельмі дзіўна, калі не выключаючы свайго далейшага знаходжання ў прэзідэнцкім фатэлі Лукашэнка прыслухаецца да падобных заклікаў.

Самае цікавае, што пры ўсіх маршах і сходах недзе далёка-далёка засталося галоўнае свята, што падкрэслівае адметнасць і самабытнасць Беларусі як дзяржавы і тое, што само па сабе мусіць надаваць вагу яе асноўнаму закону — Канстытуцыі.

Стаўленне да Дня Канстытуцыі, які адзначаецца 15 сакавіка, паказвае наколькі паважаюцца ў Беларусі палажэнні гэтага галоўнага для краіны дакумента. Калі ўзяць тыя ж прэзідэнцкія паўнамоцтвы, якія не могуць быць больш за 5 гадоў і толькі двойчы для аднаго чалавека, то, нават, малейшая спроба нешта змяніць у гэтым дачыненні мусіць выклікаць у грамадстве абурэнне. Але пакуль з боку апазіцыі у асноўным гучаць галасы супраць падаўжэння колькасці прэзідэнцкіх кадэнцый А. Лукашэнкі. Факт жа магчымасці змянення Канстытуцыі (у другі, дарэчы, раз) са згоды гаранта яе захавання ўспрымаецца даволі спакойна і не выводзіць на маршы і сходы пратэстуючыя масы.

Няхай падзе Рым, але пераможа закон — гаварылі старажытныя рымляне. Магчыма, дзякуючы гэтаму Рым называюць Вечным горадам. Беларусь — не Рым, таму можа і не трэба тут надаваць асаблівай увагі напаўзабытаму святу напаўзабытага Закона?

Уладзімір Лапцэвіч

## Форум у Мікалайках

26-28 лютага 2003 г. у Мікалайках (Вармінска-Мазурскае ваяводства) адбыўся XI Эканамічны форум Усходніх рынкаў, у якім прыняло ўдзел каля 500 прадпрыемстваў і фірм з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы, Латвіі, Літвы і Польшчы. У ходзе форуму была адкрыта экспазіцыя „Экспарт-Усход 2003” і выстаўка сучасных тэхналогій у галіне выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі.

Асноўнай мэтай XI Форуму было прадстаўленне актуальнай інфармацыі аб стане і шляхах развіцця супрацоўніцтва польскіх прадпрыемстваў і фірм з партнёрамі з краін Усходняй Еўропы, а таксама ўстанаўленне прамых кантактаў паміж удзельнікамі форуму.

Разглядалася пытанне аб паслядоўнасцях уступлення Польшчы ў ЕС для гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі рэгіёна.

Дзяржаўныя дзеячы Польшчы, якія ўдзельнічалі ў форуме, у сваіх выступленнях адзначылі неабходнасць наладжвання кантактаў паміж Беларуссю і Польшчай ва ўсіх галінах супрацоўніцтва.

www.mfa.gov.by

# Непазбежны Еўрасаюз

[1 ☞ працяг]

беларускага навуковага і стыпендыяльнага маладзёжнага абмену:

— Справа ў працягванні рукі непасрэдна да людзей.

Владзімеж Цімашэвіч перасцерагаў у еўрасаюзным рэферэндуме выказвацца супраць уваходу Польшчы ў ЕС:

— Быў бы гэта канчатковы канец. Немагчыма другі раз выказвацца ў гэтай справе. Увесь дагаворны працэс трэба было б паўтараць ад пачатку, і то не ў адносінах да 15 краін, як цяпер, а ўжо 24.

Зазначыў:

— Уваход у Еўрасаюз гэта пачынанне не ўрадавае, а нацыянальнае.

ца перадуваходнымі сродкамі па прычыне ўласнай фінансавай слабасці. У значнай большасці, каб атрымаць еўрасаюзную ўспамогу, трэба ў адпаведныя праекты ўкласці палову ўласных сродкаў. Прытым, як дадаў — без рэформы публічных фінансаў немагчымая будзе ўрадавая падтрымка паасобных гмін.

Маршалак Януш Кшыжэўскі ў мультымедыяльнай прэзентацыі (рухомыя слайды і музыка) прадставіў інфармацыю, як вялікімі перадуваходнымі сродкамі карысталіся паасобныя паветы, пачынаючы ад 1990 г. Найменш з еўрасаюзнай дапамогі меў карысці Замбраўскі павет (17 праектаў на суму 174,5 тыс. еўра), найбольш — Беластоцкі і сам Беласток (больш за 30 млн. еўра). Больш-менш пасярэдзіне апынуліся паветы Сямятыцкі (10 праектаў, каля 1,5 млн. еўра), Гайнаўскі (15 інвестыцый на суму больш за 1,6 млн. еўра) і Бельскі (каля 1,7 млн. еўра). Шмат грошай атрымаў Сакольскі павет (больш за 23,6 млн. еўра), аднак у 90% гэтыя сродкі паглынула разбудова пагранперахода ў Кузніцы.

**Міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, якога „Ніва" папрасіла ўдакладніць ідэю адкрыцця Польшчы пасля ўваходу ў Еўрасаюз і еўрасаюзных партнёраў у адносінах да Беларусі, сказаў:**

— Польскія прапановы, якія кранаюць будучую ўсходнюю палітыку пасля пашырэння ЕС, зыходзяць з наступных прадпасылак: адкрытасці, актыўнасці, прыязнага стаўлення, гатоўнасці да супрацоўніцтва, гатоўнасці несці дапамогу. На якіх абшарах? Усе і ўжо традыцыйна выказваюцца на тэму неабходнасці падтрымкі дэмакратычных перамен, не толькі ў гаспадарцы. Мы, вядома, гэта пацвярджаем. Аднак, прапануем погляд на гэта ў даўжэйшай перспектыве. А гэта ў сваю чаргу схіляе нас да сцвярджэння, што трэба памагаць, нават у першую чаргу, у будаванні ў Беларусі адкрытага грамадства. Значыць, неабходна такое супрацоўніцтва, будаванне такіх кантактаў і еўрапейскіх праектаў, якія дадуць такі вынік, што ў грамадстве Беларусі і іншых грамадствах нашых усходніх суседзяў будзе больш людзей адкрытых на свет, распараджаючыхся адпаведнымі ведамі, моцна матывіраваных для таго, каб як і палітычныя, так і грамадска-эканамічныя стандарты Еўропы пераносіць у свае краіны. Справа якраз у такім адкрыцці. Адначасова тая польская канцэпцыя (думка) выразна паказвае на неабходнасць індывідуалізаванага падыходу да паасобных суседуючых з намі краін па прычыне адрозненняў, якія сярод іх выступаюць і на патрэбу ўжывання прынцыпу ўмоўнасці. Гаворым нават аб патрэбе своеасаблівых планаў дзеяння (aktion plan) у адносінах да гэтых паасобных краін, у якіх дакладна акрэслівалася б, якія мэты трэба дасягнуць, якія ёсць умовы перасоўвання на чарговыя этапы супрацоўніцтва, і што той пашыраны Еўрасаюз гатовы на паасобных этапах прапанаваць, які від дапамогі. У выпадку Беларусі, у ступені значна большай, чым у выпадку іншых, суседніх на ўсходзе дзяржаў, гэтыя ўмовы вяжуцца з сістэмай і палітычнай практыкай дадзенай краіны, хоць у кожнай з іх гэта ў нейкай ступені праблема.

(пытаўся мах)

Асаблівую ўвагу міністр Цімашэвіч звярнуў на неабходнасць як найхутчэйшага (ужо зараз) падрыхтавання праектаў, на якія паплывуць еўрасаюзныя грошы, значыць, на патрэбу заранёў падрыхтавацца да чэрпання карысці ад уваходу ў Еўрасаюз 1 мая 2004 года:

— У 2004-2006 гадах атрымаем два разы больш сродкаў з еўрасаюзнае касы, чым агулам атрымалі мы дагэтуль у рамках перадуваходнай дапамогі.

Падкрэсліў:

— Уваход у ЕС карысны, ды перш за ўсё непазбежны.

Расчараванне міністра Цімашэвіча выклікае факт, што шмат падляшскіх гмін не карыстаецца перадуваходнымі еўрасаюзнымі грашыма (напр., гміны былое заходняй часткі былога Беластоцкага ваяводства), не распрацоўвае адпаведных праектаў.

— Нельга так. Адкуль жыхары могуць мець перакананне аб карысцях ад уваходу ў Еўрасаюз, калі, як дагэтуль, не мелі з гэтага ніякай карысці?

Цімашэвіч, аднак, заўважыў, што ў значнай частцы гміны не карыстаюц-

— Асноўная справа на сённяшні дзень — балансаванне ўласных магчымасцей, каб на пачатак магчы карыстацца еўрасаюзнымі грашыма ў 2004-2006 гадах, — пераконваў маршалак.

Тым часам, калі працягвалася канферэнцыя, у беластоцкіх мікрараёнах паявіліся ўлёткі Лігі польскіх сем'яў (LPR), заклікаючыя галасаваць супраць уваходу Польшчы ў ЕС. Польскім дыпламатам ставілася ў закід палітычнае ашуканства ў час уваходных размоў у Капенгагене, а ўваход у Еўрасаюз, на думку таямнічых дзеячаў LPR, пагражае грамадска-палітычным крызісам.

Мацей Халадоўскі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Геня Палоцкая, Марыся Федарук, Галіна Рамашка, Ада Чачуга, Міхась Хмялеўскі, Георгій Валкавыцкі, Віталь Луба, Яня Чэрнякевіч, Вера Леўчук-Валкавыцкая, Міра Лукша, Валя Жэшка і Вера Папова — частка прысутных на юбілеі*

# Юбілей

Цяжка сабрацца тым, хто на „Ніве" рабіў і робіць. Хто з ратаёў арэ патойбаковыя палеткі, хто тут, нямоглы, паціхеньку даглядае свой загончык, а не заўсёды ў сіле дабрацца ў роднае сяло, дзе шчыруе моладзь. Маладыя ўсе духам, хто застаўся, хай і не целам. І сабраліся, хто даў рады, на юбілей першага рэдактара Георгія Валкавыцкага, які спраўляла сабе „Ніва" (заадно і ўласнае саракасямігоддзе). „Ніва" нарадзілася 4 сакавіка, 1956 года, а Жорж — 13, але добры кавалак часу раней. Восемдзесят Георгію Валкавыцкаму, а хто скажа? І „Ніва" ж таксама трымаецца спраўна, аж некаторых дзіў бярэ. Дае Бог моц ды здароўе, а талент працай развівай. Рук не складвай. Шукай сабе падобных, надзейных, разам сумленна рабеце. Разам чакацьмеце спору і плёну.

— З вялікім гонарам хачу прыгадаць Тваю высакародную дзейнасць у развіцці беларускага руху ў пасляваеннай Польшчы, а менавіта: быў Ты адным з галоўных заснавальнікаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы, — чытаў свае віншаванні ўсхваляваным голасам Міхась Хмялеўскі, адзін з першых, хто на ніве стараўся. — І быў шматгадовым намеснікам старшыні Галоўнага праўлення БГКТ. Быў Ты адначасова арганізатарам рэдакцыі штотыднёвіка „Ніва" і яе галоўным рэдактарам. Ты арганізаваў Беларускае літаратурнае аб'яднанне і шмат гадоў узначальваў яго, выдатна дапамагаючы развіваць крылле пачынаючым літаратарам. Твае заслугі ў галіне беларускай журналістыкі, беларускай літаратуры і культуры залатымі літарамі запішуцца ў скарбніцу Беларушчыны ў Польшчы...

Званілі і віншавальныя тэлефоны, адрываючы Юбіляра ад застолля. „Кампанія нявелька, але бардзо пажондна" — амаль усіх прысутных бачым на здымку, які зрабіла Гандзя Кандрацюк. Віктар Бура, шчыры працаўнік на родных палетках, з Гайнаўкі прыпамінаў працу Юбіляра ў развіцці беларускага асяроддзя, у падтрыманні яго гістарычнай спадчыны. Не кожны засеў за нашымі застаўленымі здаровай (тут таксама слухаем майстра!) стравай пісьмовымі сталамі, якія, адмыслова ўстаўленыя, былі за банкетныя. Не хапала Сакрата Яновіча, які не дабраўся з Крынак, чамусьці не дайшоў з недалёку Валодзя Паўлючук... І, вядома, не было тых, хто адышоў, а так, як і мы, вясёла ўспаміналі б былое. А пра іх гучалі анекдоты. Бо прыгод, авантураў нават несусветных, было шмат. І таму юбілей Рэдактара быў і нашым годдзем, хоць не такім поўным. І хоць абліччы некаторых паараны няўмольным часам, разгладжвала іх усмешка. Сыпалі анекдотамі як з рукава, адзін праз аднаго. Як то за адным ганяўся па рэдакцыі ашалелы раўнівы афіцэр з пісталетам (вядома, праз памылку), як у Рыбалах другі на вяселлі паспрачаўся з бацюшкам наконт існавання Бога... Як трэцяму раптам стала „цяжка" на полі з фотаапаратам... Успомніліся месцы, дзе „Ніва" мела свае сядзібы, і той падстрэшкавы кабінет Георгія Валкавыцкага, дзе ён мусіў сядзець сагнуўшыся, упіраючы сваю высокую фігуру ў дах... Нараджаліся нумары, гадавікі, дзеці, унукі... Цяпер нараджаюцца кнігі. А ў кнігах Рэдактара — тое, што было. І ёсць.

Міра Лукша

*Віктар Швед*

## *ЮРКУ ВАЛКАВЫЦКАМУ ў Яго васьмідзесяцігоддзе*

*Усе мы, Юрка, маладымі*
*Са словам пачалі змагацца.*
*Ты першы ў паэтычным уздыме*
*Пазнаў сакрэты творчай працы.*

*На родны вывёў нас палетак*
*Каб шчасця сеялі зярняты,*
*Каб вырасталі з нас паэты,*
*Каб мы сабралі плён багаты.*

*І можам сёння ганарыцца:*
*Не ленаваліся мы працы.*
*Мы з роднай чэрпалі крыніцы*
*І творча сталі ўзбагачацца.*

*Хутка мінае час імклівы*
*І не памогуць тут дакоры.*
*На роднай пастаянна „Ніве"*
*Спелім, галубім свае творы.*

*Жыві нам сотню гадоў, Юрка,*
*І ў творчым будзь заўсёды ўздыме.*
*Мы, рады, на Тваім падмурку*
*Трывалы ўзнеслі наш будынак.*

Беласток, 13.03.2003 г.

**Хор „Васілёчкі" запрашае**

# Спяваць кожны можа

Калі хто ўлюбёны ў беларускую песню і жадае спяваць у хоры, дык запрашаюць да сябе „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, якія рэпетуюць у Бельскім доме культуры (па вул. 3 Мая, 2) заўсёды па пятніцах, з 17 гадзіны. Хору патрэбныя мужчыны (тэнары, сапрана).

За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца да кіраўнічкі хору Галены Пашкоўскай, таксама па тэлефоне 833-18-97 (пасля гадзіны 15). (яц)

# Ад удзячнага слугі

Мы, беларусы, жывем на тое, каб нашы суседзі адчувалі сябе высакародна, час ад часу падаючы нам міласціну. Дзеля таго і збудавалі нам муляж нацыянальнага жыцця. А мы задаволеныя, сытыя, толькі і думаем пра тое, каму б за гэтае шчасце руку палізаць. Так кажа Яўген Мірановіч („Пра дзеячаў і герояў", „Ніва" № 11 ад 16.03.2003).

*У нас на Беласточчыне адна група дзеячаў зможа наладзіць дзень спеваў на мясцовых гаворках (...), другая — выдаваць часопісы, трэцяя — займацца літаратурнай творчасцю, але без дзяржаўнай фінансавай падтрымкі ўсё гэта памерла б не выдаўшы нават стогну.* Шкада робіцца польскіх чыноўнікаў, якія сілком трымаюць пры жыцці непатрэбнага нікому нябожчыка, надуваючы яго грашамі, павялічваючы і так бяздонную дзіру ў бюджэце краіны. Усё дзеля таго, каб адчуць сябе лепшымі?

Толькі як яны знайшлі нас — неўдалот, адвечных слуг, прыстасаванцаў? Чаму яны конча нам сунуць тыя пахучыя друкарскай фарбай залатоўкі? Сваё самаадчуванне маглі б палепшыць успамагаючы сірот, інвалідаў, бяздомных або кульгавыя польскія спартыўныя клубы. Увесь народ быў бы ўдзячны, а не адно група „нашых", якую ледзь удалося сфармаваць, каб запоўніць усе тыя нівы з часопісамі, радыё і тэлеперадачы, фольк і рок-гурты, школы з навучаннем беларускай мовы і кафедры беларусістыкі. Шырока па-за Беласточчынай вядомая ж гісторыя — дакацілася была ажно ў Парыж да святой памяці Ежы Гедройца, — як то ўлады Універсітэта ў Беластоку стваралі Кафедру беларускай культуры. Пісалі праекты, слалі лісты, выдавалі беларускія гістарычныя сшыткі. Шматгадовая планавая дзейнасць у рэшце рэшт прынесла плён: выгадавалі Яўгена Мірановіча.

Памятаем таксама дабрадзеяў, якія ў 80-я гады мінулага стагоддзя вылаўлівалі нашых хлопцаў па розных вышэйшых школах і заганялі іх у Беларускае аб'яднанне студэнтаў. Іншыя ў 90-х выдавалі „Часопіс", каб з'явіўся ў нас Юрка Хмялеўскі з калегамі. На маё шчасце, хтось у далёкай Варшаве падумаў і пра Ваўранюка, адчыняючы у Беластоку асяродак тэлевізіі.

Вось якія мы дзеячы і героі! Аж свету Божага шкада, што мы паскудзім яго сваёй прысутнасцю. Мы — брыдкае выключэнне ў наваколлі прыгожых, згодных, міралюбівых, працавітых народаў. Нашы суседзі не сварацца, выбіраюць спасярод сябе найбольш вартасных правадыроў і пад іхнім бацькоўскім вокам будуюць светлую сваю будучыню.

Да гэтай пары была ў нас хоць вера ў тое, што калісьці жылі на свеце і беларусы, якія хацелі, каб у іх было ўсё па-людску, як у суседзяў. Але на табе, Яўген Мірановіч і на іх знайшоў у прапахлых пылам і мышынымі бобікамі архівах кампрамат. Аказваецца, легендарныя партызаны Хмара і Скамарох ніякія не атаманы на чале многатысячнай арміі, а ўсяго няўдалыя гульцы ў карты, якія ўбачыўшы, што ў іх калодах адны дзевяткі, паспрабавалі прадаць іх даражэй, чым яны былі вартыя. Блеф не ўдаўся. Шкада. Яшчэ больш шкада разбуранага Мірановічам міфа. Пасля такога ўдару зноў уздымаецца адвечнае на Русі пытанне: „Як жыць?"

За адказам далёка не трэба ісці. Народная мудрасць падказвае: „Мая хата з краю". Хай сабе Скамарох з Хмарам у магіле перакручваюцца ад таго, што пра іх напісаў Мірановіч. Мне няма часу пра гэта думаць, бо трэба ехаць рамантаваць самаход. Каб заўтра завезці дзяцей на ўрок беларускай мовы.

Мікола Ваўранюк

**Вачыма паляка**

# Вайна: прытулак у пушчы

Калі пішу гэтыя словы, свет адлічвае дні, а нават гадзіны да вайны з Іракам. Садам Гусейн заявіў, што калі толькі яго дзяржава падвергнецца нападу — „будзе змагацца ў кожным месцы ў свеце". Можна, значыць, спадзявацца, што таксама і ў Польшчы, якая адназначна падтрымала ваенную палітыку Джорджа В. Буша, а амерыканскія інтарэсы ў Багдадзе прадстаўляе польскае дыпламатычнае прадстаўніцтва. Сам амерыканскі прэзідэнт не выключае, што іракскі правадыр скарыстае хімічную або біялагічную зброю; падпаліць таксама 1 500 вышак з нафтай. Прадстаўнікі польскага ўрада і прэзідэнта, аднак, супакойваюць нас, што мы не ў першай групе краін, якім непасрэдна пагражае помста. Прэм'ер Лешэк Мілер і прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі заявілі, што колькасна польскі ўдзел у вайне будзе вельмі малы. У Ірак пашлюць да 200 жаўнераў, сярод іх — спецатрад „ГРОМ" і абслуга польскага карабля-шпіталя. Польскія жаўнеры, як прызыўнікі, так і прафесіяналы, пададуцца на вайну толькі тады, калі самі пісьмова здэкларуюць такую ахвоту, значыць, яны — добраахвотнікі.

Ведаеце, не дам сабе руку адняць, што Польшча слушна вырашыла, так адназначна і катэгарычна падтрымліваючы палітыку ЗША ў адносінах да Ірака. Супраціўляючыся вайне Нямеччына, Францыя ці Расія гэтым самым спрабавалі забяспечыцца ад магчымых, інспіраваных у кругах іракскіх і шырэй — мусульманскіх экстрэмістаў, тэрарыстычных актаў. Не без значэння тут тое, што якраз у Францыі і Нямеччыне ад гадоў пасяляліся і пражываюць, на розным статусе, прадстаўнікі арабскага свету, таксама і экстрэмісты, толькі часткова вылаўленыя пасля славутага 11 верасня. Падобна як і ў аслабленай сёння мілітарна Расіі, ёсць праблемай ваяўніча настроеная частка мусульманскага грамадства. Нямеччына, Францыя ці Расія могуць апасацца таго, што пасля выбуху вайны ў Іраку ўзгаральныя ачагі запалаюць таксама і ў гэтых краінах. З гэтага пункту гледжання, Польшча фактычна можа адчуваць сябе больш бяспечнай, хоць гэта толькі тэарэтычныя роздумы, паколькі ў мяне няма верагодных звестак у гэтай справе. Памятаю, аднак, што калі ў чэрвені 1999 г. папа Ян Павел II прабываў з чарговай пілігрымкай у Польшчы, журналісцкі свет абегла інфармацыя, што ў час ягонае пабыўкі ў Вроцлаве мела дайсці да спробы замаху на яго асобу. Гаварылі, што стаяць за гэтым арабскія замежныя экстрэмісты, якія мелі збіць над Вроцлавам папскі верталёт. Ніхто гэтага афіцыйна не пацвердзіў і не ведаю, наколькі гэта праўда і ці ўвогуле ў гэтым ёсць штосьці з праўды. Аднак, разглядаючы справу тэарэтычна, гэта магло б быць магчымым. Тады, але і цяпер пасля атакаў на Цэнтр сусветнага гандлю ў Нью-Йорку, асабліва Еўропа не ў змозе справіцца з адмысловым тэрорам у адносінах да „няверных".

Вынікі вайны ў Іраку могуць пакінуць адбітак на г.зв. еўрапейскім і, шырэй, сусветным парадку. Пад знакам пытання можа стаць падпісанне ўваходнага трактата ў справе пашырэння Еўрасаюза, таксама на Польшчу, планаванага на палову красавіка. На жаль, сёння ў мяне ўражанне, што няма ўжо магчымасці адступлення. На чорны сцэнарый накладваюцца яшчэ інфармацыі аб новым вірусе, які выклікае нявылечнае запаленне лёгкіх. На мясцовым рынку — крызіс дэмакратыі ў Польшчы, звязаны з г.зв. афёрай Рывіна і ўзнікненнем меншаснага ўрада. На Падляшшы — клопаты з бюджэтам і чарговыя планаваныя скарачэнні ледзь не ва ўсіх сферах жыцця. Значыць, зайздрошчу маёй знаёмай, у якое ёсць хата на ўскраіне Белавежскай пушчы. Заўсёды можа там схавацца, а Пушча яе пракорміць. А, дарэчы: цікава, ці сённяшні польскі міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, калі ўсяляўся ў свой новы дом якраз у Белавежскай пушчы, прадбачваў тую чорную будучыню?

Мацей Халадоўскі

# Да ўгодкаў Францішка Аляхновіча

9 сакавіка мінула 120 гадоў з дня нараджэння Францішка Аляхновіча, беларускага віленскага драматурга, публіцыста, акцёра і тэатральнага дзеяча. Быў сынам скрыпача, нашчадкам шляхецкага роду з-пад Радашковіч. Хаця вучыўся ў шматлікіх школах, закончыў толькі адну — Варшаўскую драматычную школу ў 1904 г. Раней быў вучнем хіміка-тэхнічнай школы ў Вільні і слухачом Ягелонскага універсітэта ў Кракаве. Ад маладосці ў цэнтры яго зацікаўленняў быў тэатр. Акцёрскую кар'еру пачынаў у польскіх вандроўных трупах. У 1908 г. вярнуўся ў Вільню, дзе пачаў выдаваць сатырычны часопіс „Пэркунас". Сатыра, асабліва палітычная, у царскую эпоху была даволі небяспечным заняткам. За друк вершаў і рысункаў прысвечаных віленскім расійскім палітыкам Аляхновічу пагражала зняволенне. Таму ў 1910 г. вымушаны быў спешна выехаць у Галіччыну. Прабываў у Кракаве і Львове, выступаючы на падмостках вандроўных тэатраў. Карыстаўся псеўданімам „Монвід", якім пасля падпісваўся ў публіцыстычнай творчасці.

У 1913 г. з надзеяй, што царскія ўлады забылі пра яго сатырычную дзейнасць, Аляхновіч вярнуўся ў Вільню. Але аказалася, што не забылі і пасадзілі ў турму на цэлы год. У віленскай турме Лукішкі паўстаў яго першы драматычны твор *На Антокалі*. Пасля вызвалення выконваў шматлікія прафесіі — быў пажарнікам, маляром, кантралёрам электрасетак, настаўнікам, карэктарам у газетах. У 1917 г. пачаў супрацоўніцтва з беларускім часопісам „Гоман". У чэрвені 1918 г. перасяліўся ў Мінск, дзе пачыналі ўзнікаць структуры беларускай дзяржаўнасці. Аляхновіч стаў адным са стваральнікаў Беларускага дзяржаўнага тэатра.

У 1919 г. вярнуўся ў Вільню, якую ў красавіку зянялі польскія войскі. Пачаў выдаваць газету „Беларускае жыццё". З яе зместу вынікае, што спачатку паверыў у праўдзівасць прапаганды палякаў наконт федэралізму, свабоды і вызвалення беларускіх земляў. Акупанты ў Мінску мяняліся тады кожныя некалькі месяцаў. У 1921 г. Аляхновіч не верыў ужо нікому. „Незалежнасць і свабода, — пісаў, — толькі ў сіле беларускага народу". Але народ не меў такой сілы.

У 1922-1923 гадах, пражываючы ў Вільні, дапамагаў Беларускаму выбарчаму камітэту на выбарах у польскі парламент, пісаў фельетоны пра тэатральнае жыццё ў газету Людвіка Абрамовіча „Przegląd Wileński", але перш за ўсё складаў драмы — *Няскончаная драма*, *Заручыны Паўлінкі*, *Птушка шчасця*, *Шчаслівы муж*. Прабаваў арганізаваць у Вільні беларускае культурнае жыццё, але ўсё найчасцей канчалася дэманстрацыяй непрыхільнасці ці нават варожасці з боку мясцовых палітычных і грамадскіх польскіх элітаў.

У Савецкай Беларусі тым часам пачынаўся працэс беларусізацыі рэспублікі. Аляхновіч паверыў, што ў Мінску будзе магчымым ажыццяўляць свае мары пра беларускі тэатр. 17 лістапада 1926 г. выехаў у Беларусь і выступіў да ўлад за савецкае грамадзянства. Далі яму пры канцы снежня і пару дзён пазней арыштавалі. Прысудзілі 10 гадоў пабыўкі на Салаўках. Пару гадоў пасля напісаў: „У краіну саветаў ехаў я як папутчык, прыхільнік, веруючы, што там ствараецца новае прыгожае жыццё, што там атрымаю шырокія магчымасці працы на беларускай мове. Я так бескрытычна верыў у савецкую ілюзію, што нават агентаў Галоўнага палітычнага ўпраўлення (ГПУ) лічыў людзьмі годнымі даверу, амаль сябрамі".

Аляхновіч на Салаўках прабываў да 1933 г. У рамках абмену палітычнымі вязнямі саветы аддалі яго палякам за Браніслава Тарашкевіча. У 1935 г. паказалася кніжка Аляхновіча *У кіпцюрох ГПУ* на польскай мове. Пасля перакладалася яна амаль на ўсе мовы свету. Было гэта першае апісанне лёсаў зняволеных у сталінскіх канцлагерах.

У 1939-1941 гадах скрываўся перад саветамі на Літве. У час нямецкай акупацыі вярнуўся да выдавецкай дзейнасці. Ад 1 сакавіка 1942 г. стаў выдаваць у Вільні газету „Беларускі голас". Апрача беларускай прэсы ў акупаванай немцамі Вільні выдаваліся літоўскія і польскія часопісы. Літоўцы імкнуліся не дапусціць да выдання „Голасу". Палякаў лічылі яны каланізатарскай нацыяй на Віленшчыне, але беларускамоўнае насельніцтва вакол Вільні ніяк не апраўдвала літоўскай прапаганды пра літоўскасць гэтай зямлі. Таму кожная беларуская газета ці школа лічылася пагрозай для літоўскай палітыкі. Аляхновіч, аднак, не лічыў літоўцаў галоўнай пагрозай для беларусаў. У сваёй газеце змяшчаў перш за ўсё вельмі крытычныя артыкулы пра савецка-расійскую і польскую палітыку адносна Беларусі. У „Беларускім голасе" друкаваліся матэрыялы, якія паказвалі акупацыйны характар польскай і савецкай улады на Беларусі ў 1920-1941 гадах. Адны і другія маглі рэдактара газеты лічыць ворагам. 3 сакавіка 1944 г. Аляхновіч быў забіты ў сваёй кватэры па вуліцы Ясінскага ў Вільні. Даследчыкі адназначна, пакуль што, яшчэ не высветлілі хто загадаў гэтае забойства. Прыблізна столькі ж гісторыкаў прыйшло да высновы, што забойства Аляхновіча адбылося за справай як палякаў, так і саветаў.

Яўген Мірановіч

# Баскі: няма як у сваёй аўтаноміі

У Еўропе сягоння ў трох рэгіёнах гавораць на баскскай мове: у Аўтаномнай супольнасці Краіне баскаў, у Навары — абодва рэгіёны знаходзяцца ў сучаснай Іспаніі, ды ў французскім дэпартаменце Пірэнеяў-Атлантыкі. Хоць у абодвух дзяржавах — Іспаніі і Францыі — баскі складаюць нацыянальную меншасць, але па нашых, беларускіх, мерках меншасць тая і заўважальная, і моцная.

Насельніцтва ўсёй Краіны баскаў (сталіца ў горадзе Віторыя) перавышае два мільёны жыхароў (1991 г.). Як і наша малая — у параўнанні з тэрыторыяй баскаў — Беласточчына, баскскі аўтаномны рэгіён дасведчыў перамяшчэнняў насельніцтва з вёскі ў гарады ў час паскоранага развіцця прамысловасці, галоўным чынам у 60-я і 70-я гады. Прагрэс той запаволіўся ў 80-я і спрычыніўся з'явам добра вядомым і ў нас — спаду капіталаўкладанняў у рэгіён, беспрацоўю, ...

Баскская мова (euskera) моцна адрозніваецца ад іспанскай і яе выкарыстанне ў публічным жыцці залежыць ад зоны — такіх моўных зонаў у Краіне баскаў чатыры, а выдзяляюцца яны паводле таго, колькі ў данай зоне насельніцтва, якое размаўляе на баскскай мове (людзей, якія ведаюць і карыстаюцца баскскай мовай называюць euskalduns). Раёны, у якіх за 80 працэнтаў euskalduns — гэта толькі чатыры працэнты ўсяго насельніцтва Краіны баскаў. Пятую частку грамадства складаюць тыя рэгіёны, у якіх палова і болей гаворыць на баскскай, менш за палову — таксама пятая частка грамадства. І ўсё ж больш за палову насельніцтва (56 працэнтаў) складаюць раёны, у якіх лік euskalduns меншы за 20 працэнтаў. Іспанская з'яўляецца роднай для 74 працэнтаў насельніцтва Краіны баскаў, хоць трэба адзначыць пастаянны рост людзей, для якіх абедзве мовы — іспанская і баскская — з'яўляюцца роднымі. А дзеецца тое па прычыне ўвядзення баскскай мовы ў школу.

Юрыдычны статус баскскай мовы запісаны ў іспанскай канстытуцыі і статуце баскскай аўтаноміі, у якіх сцвярджаецца, што, побач іспанскай, баскская з'яўляецца афіцыйнай мовай Аўтаномнай супольнасці Краіны баскаў. У прыватнасці, усе грамадзяне Краіны баскаў маюць права карыстацца абедзвюма афіцыйнымі мовамі вусна і пісьмова. Што гэта абазначае на практыцы? На практыцы грамадзяне могуць, між іншым, звяртацца ў публічныя ўстановы на любой з гэтых дзвюх моў без неабходнасці прад'яўлення перакладаў або перакладчыка.

Ужыванне баскскай мовы ў жыцці і яе навучанне ў школах рэгламентуецца шэрагам дэталёвых заканадаўчых актаў. У Краіне баскаў існуюць тры віды навучання — класы з іспанскай мовай навучання, у якіх баскская дазваляецца як мова дадатковых заняткаў, класы з баскскай і іспанскай мовамі навучання ды класы, у якіх навучанне праводзіцца выключна на баскскай мове. Два апошнія віды класаў былі ўведзены ў 1983 годзе. Да гэтага часу баскскай мовай карысталіся выключна прыватныя школы. Як навучанне адбываецца на практыцы, сведчаць прыклады. Вось, прадшколлі: 41 працэнт працуе выключна на баскскай мове, 32 працэнты — на абодвух, а рэшта на іспанскай, прычым наглядаецца рост першай групы і спад апошняй. Баскская мова з'яўляецца абавязковай ва ўсіх сярэдніх школах. А ва Універсітэце Краіны баскаў 39 працэнтаў усіх абавязковых заняткаў выкладаецца менавіта на баскскай мове. У Францыі усяго 3 тысячы дзетак вывучае баскскую мову — і гэта на вельмі асноўным узроўні (лік параўнальны з навучаннем беларускай мовы на Беласточчыне).

Да 1986 года ўсе газеты ў Краіне баскай друкаваліся выключна на іспанскай мове. У тым жа 1986 годзе з'явіліся дзве двухмоўныя газеты, якія да 1993 года дацягнулі свой тыраж да 106 і 103 тысяч асобнікаў. У 1990 годзе з'явілася яшчэ і газета, якая поўнасцю выходзіць на баскскай мове (яе тыраж у 17 тысяч), і якая распаўсюджваецца па ўсім арэале баскскай мовы — таксама і ў Францыі. Усе іспанскамоўныя газеты ў Краіне баскаў рэгулярна выпускаюць дадаткі на баскскай мове. Мяркуецца, што баскскія газеты могуць разлічваць на тысяч 250 чытачоў. У 1991 годзе ў Краіне баскаў выдалі 966 кніжак на баскскай мове — збольшага пароўну раздзяліліся яны на дзіцячую літаратуру, тэхнічную літаратуру і падручнікі. Кіно ў Краіне баскаў карыстаецца выключна іспанскай мовай, але ўсе прадзюсеры маюць абавязак выпусціць баскскамоўны варыянт фільма. Дзеля гэтага ўрад Краіны баскаў дафінансоўвае кінапрадукцыю сваімі датацыямі. Некалькі баскскіх газет выходзяць і ў Францыі, але іхні тыраж хутчэй набліжаны да колькасці „Нівы" на Беласточчыне, чымсьці да тых дзесяткаў і сотняў тысяч, якія распаўсюджваюцца ў самой Краіне баскаў.

*Баскскі краявід*

Прыклад баскскай аўтаноміі, якая суправаджаецца адпаведнымі заканадаўчымі актамі, паказвае што менавіта такая форма найбольш спрыяе ўсталяванню стабільнасці нацыянальнай меншасці. Нацыянальная меншасць у грамадстве перш за ўсё адметная сваёю мовай і здольнасцю або няздольнасцю карыстацца ёю ў публічным жыцці. У Краіне баскаў наглядаецца рост ужывання роднай мовы ў 5-14-гадовым узроставым прамежку. Гэта дзеці і моладзь, якая ўзрастае ва ўмовах спрыяльнай меншасці адукацыйнай сістэмы.

Аляксандр Максімюк

*(усе прыведзены ў артыкуле лічбы — паводле http://www.uoc.edu/euromosaic/)*

## *У Еўропе аднолькавых шанцаў*

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жарабёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

## *2 конкурснае пытанне*

Што ў баскаў абазначаюць тэрміны *euskera*, *euskalduns*?

*Адказ:* .....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

.....

*Імя і прозвішча:* .....

*Адрас:* .....

*(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 6 красавіка 2003 г.)*

# Пад знакам „белавежцаў"

Цэнтральныя элімінацыі IX выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія адбыліся 5 сакавіка ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, праходзілі пад знакам творчасці „белавежцаў". Ліцэісты пісалі пісьмовыя працы пра творчасць выбранага празаіка або паэта з Літаб'яднання „Белавежа". Трэцяя тэма тычылася любімай кнігі. Многія пісьмовыя працы аказаліся вельмі добрымі і з ліку 24 удзельнікаў алімпіяды ажно 8 стала лаўрэатамі.

Вучні найчасцей аналізавалі мініяцюры Сакрата Яновіча, паэзію Алеся Барскага і Віктара Шведа. Некаторыя асобы пісалі пра паэзію Надзеі Артымовіч. Тыя ліцэісты, якія рашыліся выказацца пра сваю любімую кнігу, ужо не адклікаліся да творчасці „белавежцаў", толькі пісалі пра творы, якія дэталёва разглядаліся на занятках беларускай мовы (між іншым пра паэму „Новая зямля" і трылогію „На ростанях" Якуба Коласа).

— Мініяцюры Сакрата Яновіча разглядаюцца на ўроках беларускай мовы ў падставовай школе, гімназіі, ліцэі і таму многія пісалі пра іх, — заяўляе член конкурснай камісіі Валянціна Бабулевіч. — Працы пра творчасць Сакрата Яновіча аказаліся вельмі добрымі. Вучні, якія пісалі пра любімую кніжку, таксама правільна і займальна абгрунтоўвалі зацікаўленне выбраным творам. Найчасцейшымі былі стылістычныя, моўныя і граматычныя памылкі.

Удзельнікам алімпіяды трэба было зрабіць пераклад фрагмента публіцыстычна-навуковага тэксту Тэрэсы Занеўскай з польскай мовы на беларускую. Паколькі быў гэта цяжкі тэкст, здараліся пераклады слова ў слова, з захаваннем польскай стылістыкі. У граматычным практыкаванні найбольш складанымі аказаліся скланенні імёнаў. У час вусных адказаў ліцэісты аналізавалі беларускую літаратуру, разважалі аб сваёй нацыянальнай свядомасці і рэлігійнай тоеснасці. Гаварылі пра культуру, традыцыі і фальклор беларусаў Беласточчыны.

— Мне трэба было расказаць пра жніво, — кажа Наталля Зофія Лемеш. — Звярнула я ўвагу на змены ў сельскагаспадарчых працах на працягу многіх гадоў. Расказвала, як людзі ад сярпа і касы перайшлі да камбайна. Мала гаварыла пра жніўныя абрады і таму вусны адказ не атрымаўся найлепшым. Пісала я пра мініяцюры Сакрата Яновіча, бо гэта мой любімы пісьменнік.

Пісьмовая праца Зосі Лемеш з Гайнаўскага белліцэя аказалася вельмі добрай і яе аўтарка стала лаўрэатам, займаючы пятае месца. Першае месца занялі Эмілія Пліс і Іаанна Врублеўская (Гайнаўскі белліцэй), другое — Магдаліна Леанчук (Ганаўскі белліцэй), трэцяе — Барбара Харкевіч і Юстына Ігнацюк (Гайнаўскі белліцэй), чацвёртае — Ева Козяк і Жанэта Роля (Бельскі белліцэй). Удзел у Алімпіядзе беларускай мовы амаль усіх вучняў у чацвёртых класаў і многіх вучняў з малодшых класаў Гайнаўскага белліцэя даў станоўчыя рэзультаты. Шэсць вучняў гэтай школы, якія сталі лаўрэатамі могуць спрычыніцца, што ў рэйтынгу арганізаваным часопісам „Перспектывы" Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы апярэдзіць Бельскі белліцэй, які раней займаў высокія месцы.

Аляксей Мароз

# Зорка

старонка для дзяцей

Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

*Пачатак вясны*

## Пампух

Дзевяцігадовая Мірця і Генюсь, маладзейшы ад сястры амаль на тры гады, застаўшыся аднымі ў хаце, рашылі пагаспадарыць. Пакуль бацькі ды дзед вернуцца з працы, нырнулі на кухню. Заўсёды царыла ў ёй баба Люба, але якраз паехала да другое дачкі. Як ніколі, быў свабодны шлях да бабуліных кухонных таямніц. Бабця, здаецца, з нічога ўмела спячы ці згатаваць такое цуда! Нават бабулін „шэры суп з бульбянымі галушкамі", які навучылася варыць у Сібіры ў бежанстве, быў найсмачнейшы ў свеце, ці забелены малаком, ці з разведзенымі ў ім скварачкамі з цыбулькай. Бабця з Сібіры прывезла, малой яшчэ быўшы дзяўчынай, і рускія словы. І калі ўнукі ды дзеці са смакам налягалі на стравы, яшчэ падахвочвала: „Кушайце, кушайце!"...

Дастаўшы з буфета тое, што ўдалося, дзеці рашылі спячы „пампухі". Гэта румяныя мучныя аладкі, добра выраслыя, пухнатыя — таму яны і пампухі.

— Трэба так... — пачала Мірця. — Муку. Малако. Соль. Яйка. Цукар. Дрожджы. Ты, Генюсь, бярыся за дрожджы.

— А нашто яны? — калупнуў хлопчык нажом пакецік з сырымі дражджамі. — Неяк дзіўна пахнуць.

— Гэта каб пампухі выраслі. Вазьмі кубачак, укінь туды трохі дражджэй, насып цукру, памяшай... І пастаў каля сцяноўкі, яны любяць цёпла.

— А што, яны жывыя?

— Пэўна так, калі растуць. А я буду муку сеяць...

Аж тры каты — Бронюсь, Мурчык ды Франя пасядалі на лаве, вырачыўшыся на маладых пекараў. Зараз і яны былі абсыпаны мукой, гэтак старалася Мірця. У вялікай місе боўтала яна ўжо ўсе кампаненты, якія, як памятала, трэба на пампухі. У цеста наліла ўрэшце ўспененыя дрожджы.

— Ну, пачакаем, як цеста падрасце, — накрылі місу чыстай анучкай і пайшлі ў садок на чарнасліў, які вельмі сёлета ўрадзіў. Там і забавілі крыху.

— Ну, ідзем пліту распальваць, — спахапілася Мірця. — І слівак укінем у пампухі, будуць усім смакаваць.

Над місай уздымаўся купал — цеста падняло ручнічок, а нават і вылезла на стол.

— Нясі хутчэй электрычную плітку, а то зусім нам уцячэ! — пляснула ў ладкі Мірця. — На патэльні нам пампухі не выйдуць! Лаві, лаві іх!

Улілі цеста ў „продзіж", дакінулі слівак. Зверху пасыпалі цукрам...

А яно далей расло! Уперлася аж у шкляную покрыўку печкі. У той час дзецям удалося неяк прыбраць кухню. А ўпартыя каты, седзячы на падаконніку, далей спакойна ўзіраліся, чакалі.

— Ой, што вы нарабілі? — мама ад парога ўчула прыемны пах з кухні. А яна ведала, што чакаць яе можа толькі сюрпрыз.

— Пампухі!

Мама выключыла печку і зняла покрыўку. Перад ёю пукаціўся адзін вялікі румяны пампух у сінія кропкі слівак. А ён раптам зашыпеў, булькнуў, пухкнуў і апаў.

Каты задаволена аблізаліся... Але ў гэты раз дасталася ім „пампуха" толькі па кавалачку. Усе частаваліся і хвалілі эксперыментальны пірог!

Міра Лукша

## *Матылёк*

*Завітаў на поле матылёк,*
*каб напіцца нектару.*
*Прыйшоў да яго ў госці жук,*
*пасябраваў з імі яшчэ павук,*
*што сплёў павуцінку для мух,*
*і пчала, якая мёд нясла,*
*і птушка, што злавіла чарвяка.*
*Усе добра гулялі, гулялі*
*і ў госці да сябе запрашалі...*

*Івона Карповіч, V „б" кл. ПШ у Гарадку*

## Урок сяброўства

У малой вёсцы жылі два сябры — Віця і Міхась. Аднойчы Віця атрымаў ад бабулькі торбачку цукеркаў. Не сказаў аб гэтым свайму сябру. Узяў і ўсе сам з'еў. Не бачыў, што дзве цукеркі ўпалі на зямлю. Знайшоў іх Міхаська і прынёс сябру. Ён раздзяліў па адной цукерцы і даў сябру. Віця не хацеў браць. Міхась стаў намаўляць. Па вялікай просьбе Віця ўсё ж узяў цукерку. Хлопчык зразумеў, што сапраўдныя сябры дзеляцца ўсім. Стала яму сорамна. Падзякаваў за пачастунак і ўрок сяброўства.

Маргарыта Красоўская
V „ц" кл. бельскай „тройкі"

## *Дзённік Міколы*

### Камень сяброўства

Раніцай, у першы дзень канікул, я падарваўся як апараны. І не толькі таму, што прысніліся самыя страшныя хвіліны мінулага года. Не. Пазваніў тэлефон.

— Мікола, чаму спазняешся? — крычала ў трубку ўсхваляваная Аня. Аня сказала, што я не шаную іх часу і планаў.

— Пачакайце яшчэ дзесяць хвілін, — папрасіў я лагодна і з пачуццём віны.

Яшчэ ў мінулую суботу мы дамовіліся на супольную вандроўку за горад. Дзяўчаты мелі паказаць нам „Камень сяброўства", які спачывае ў трынаццаці кіламетрах за нашым горадам ва ўрочышчы Сасновы Груд. Паводле легенды, камень меў магічную моц. Кожны, хто да яго дакрануўся, мяняўся на ўсё жыццё. Такі чалавек меў патрэбу шукаць у жыцці сяброў і быць верным старым прыяцелем.

Дзяўчаты падумалі, што пра вандроўку напішам артыкул у краязнаўчы часопіс „Горкаўскі гасцінец".

Я мігам памыўся і апрануўся, надзеў боты „траперкі", з'еў на хаду падрыхтаваны мамай сняданак і спусціўся ўніз.

Пасля гадзіны хады мы апынуліся за межамі горада. Прыпякала сонца. Мы рашылі пайсці напрасткі, малавядомай дарогай, лесам.

Мы ішлі ды ішлі. Час ад часу заводзілі песню, расказвалі анекдоты, я ўспомніў свой апошні сон.

— Чамусьці ў нашага лесу няма канца, — ціха сказаў Ярак пасля пяці гадзін вандроўкі. Паводле розуму і компаса, мы даўно ўжо павінны былі быць у Сасновым Грудзе.

Кожны з нас пачаў думаць — адзін пра начлег у лесе, другі пра ваўка, трэці пра маму. Я сам чуў расказы старэйшых, што ў дарозе да „Каменя сяброўства" здараюцца дзіўныя гісторыі. Нават калі ідзеш простай, дакладнай дарогай.

— Ці ведаеце, чаму растуць перашкоды ў дарозе да „Каменя сяброўства"? — раптам спытала Дамініка.

— Я ведаю адно: калі ў кампаніі няма згоды. І калі сярод вандроўнікаў ёсць фальшывыя сябры, — прыгадаў Тамаш.

Мы ўсе пачалі думаць пра наша сяброўства. Пасля загаварылі. Мы прызналіся сабе ва ўсіх дрэнных учынках. Найцяжэй было паміж Аняй і Дамінікай. Яны доўга-доўга выказвалі прэтэнзіі і ўзаемныя крыўды. Але не было выхаду. Мы, дарэчы, зрабілі ўсё, каб дзяўчаты кінулі свае старыя і новыя разборкі.

Урэшце Аня і Дамініка пацісналі сабе рукі і ішлі моўчкі. Праз дваццаць хвілін прывітала нас сонечнае праменне. Мы трапілі на паляну ва ўрочышчы Сасновы Груд. Мы дакрануліся да „Каменя сяброўства".

На месцы высветлілася, што мы вандравалі дзве гадзіны, а не, як нам здавалася — сем. У дарозе нашы гадзіннікі чамусьці заспяшаліся.

(працяг будзе)

(нак-с)

# Урок гісторыі па-беларуску

У лютым, пасля зімовых канікул, адбылося спатканне вучняў I класа гімназіі Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы са спадаром **Аляксеем Харкевічам**. Ён — былы вучань, а потым і настаўнік нашай школы.

Спатканне наладзілі настаўнікі-бібліятэкары Ірэна Ігнатовіч і Галіна Іванюк у чытальным зале школьнай бібліятэкі. Спадар Харкевіч расказаў вучням пра гісторыю школы, паказаў здымкі. На здымках увекавечаны старая школа, пабудова новай школы, табліца з абітурыентамі з 70-х і 80-х гадоў. Здымкі вельмі зацікавілі вучняў. Некаторыя распазналі на іх сваіх бацькоў, цётак ці іншых знаёмых, напрыклад, цяперашніх настаўнікаў. Распазналі, як на гітары іграе цяперашні дырэктар. Спадар Харкевіч расказаў таксама эпізоды са свайго асабістага жыцця. Як хадзіў 12 кіламетраў пехатою ў школу ў Нараўку, як ездзіў цягнікам у школу ў Гайнаўку. Многія факты аказаліся гімназістам незразумелымі. Напрыклад, чаму не едзіў на веласіпедзе, або чаму на здымку ўсе дзеці апрануты цёпла, а ногі босыя? Чаму пасля 9-га класа працаваў 2 месяцы ў „Służbie Polsce" і будаваў чыгуначную лінію Лукаў — Скернявіцы?

Гэта была вельмі цікавая сустрэча — кароткі, але акуратны ўрок гісторыі. Калі наш госць вучыўся ў Гайнаўцы, у яго класе на 40 вучняў аж 37 паходзілі з вёсак, а толькі 3 — з горада. На вёсцы яны жылі не толькі з бацькамі, але і з дзядулямі ды бабулямі. Цяпер інакш — дзеці з бацькамі жывуць у горадзе, а бабулі з дзядулямі недзе на вёсцы. На вёсцы засталася наша гісторыя, нашы карані, наша народнае багацце, пра што часта не ведаем. Не кожны патрапіць зацікавіць маладога слухача. А тут было чым, і цікавыя расказы, і старыя фатаграфіі з 1918 года, і пашпарт з 1917 г. на нямецкай і беларускай мове ды яшчэ магнітафонная плёнка Радыё Беласток з 1982 года і 1986 — голас Віктара Рудчыка і Лідзіі Гайдук; „стаднёўка" — голас моладзі і бацькоў.

На спатканні прысутны былі намеснік дырэктара А. Лаўрыновіч, класны кіраўнік Б. Ляўчук і лабарант інфарматыкі М. Смык. Яны сцвердзілі, што гэтае багацце трэба захаваць і выкарыстоўваць як дапаможнік у навуцы.

Сустрэча вялася на беларускай мове. Хаця былі гэта вучні I класа Гімназіі і ў іх яшчэ небагаты слоўнік, але з разуменнем клопату не было. На заканчэнне Аляксандр Харкевіч сказаў:

— Вы яшчэ маладыя і самі бачыце, што трэба вам многаму вучыцца.

Ірэна ІГНАТОВІЧ, настаўнік-бібліятэкар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы

**Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род**

# Кастусь Каліноўскі

**Апошнія дні Каліноўскага**

Хаваючыся ад царскіх жандараў, Кастусь Каліноўскі жыў у Вільні пад прыдуманым імем. Адзін з арыштаваных паўстанцаў на допыце выдаў расіянам свайго правадыра, і яго схапілі.

На следстве і на судзе Кастусь трымаўся надзвычай мужна. Калі яму прапанавалі аблегчыць свой лёс, назваўшы некаторыя адрасы і імёны таварышаў-паўстанцаў, Каліноўскі адказаў, што шпіёнства апаганьвае чалавека.

Расійскі суд вынес пастанову пакараць кіраўніка паўстання смерцю на шыбеніцы. Герой загінуў ад рук царскага ката 22 сакавіка 1864 года. На тым месцы, дзе гэта адбылося, у Вільні пастаўленая мемарыяльная пліта.

З турэмнай камеры Каліноўскі перадаў на волю свой напісаны па-беларуску запавет — „Лісты з-пад шыбеніцы". „Няма большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек мае розум і навуку. Тады ён толькі зможа жыць у багацці і па праўдзе. Але як дзень з ноччу не ходзіць разам, так не ідзе разам навука праўдзівая з няволяй маскоўскай. Тады толькі зажывеш шчасліва, народзе, калі над табою маскаля ўжо не будзе", — гаварылася там.

Палымяныя словы Каліноўскага клікалі беларусаў на барацьбу за свабоду і пасля яго смерці.

Сваім ахвярным жыццём Кастусь Каліноўскі заслужыў вечную памяць. Пра яго напісаныя кнігі і гістарычныя даследаванні. Ягоным імем у гарадах і мястэчках Беларусі названыя вуліцы. Мастакі і скульптары стварылі дзесяткі партрэтаў правадыра паўстанцаў.

У гарадку Свіслач на Гарадзеншчыне, дзе некалі вучыўся Кастусь, яму пастаўлены помнік. Але дасюль няма помніка славутаму сыну беларускага народа ў сталіцы нашай дзяржавы. Значыцца, і сёння ёсць тыя, хто баіцца памяці пра Каліноўскага, які аддаў жыццё за свабоду Бацькаўшчыны.

За тое, што Кастусь Каліноўскі зрабіў для Беларусі, мы называем яго нашым нацыянальным героем. Ягоны прыклад натхняе нас і сёння, калі нашая краіна адстойвае сваю незалежнасць.

(працяг будзе)

# Польска-беларуская крыжаванка № 13

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце ў „Зорку" на працягу трох тыдняў. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 9**: Яд, раб, збор, лак, камора, Іран, Ас, прадвесне, акраса, вока, ікра. Язык Ірак, яр, рака, кадр, канва, сак, баран, касета.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Тамаш Хадакоўскі**, **Януш Мінько** і **Лукаш Гайдук** з Нарвы, **Анна Бурак** і **Ева Казлоўская** з Бельска-Падляшскага, **Альжбета Антанюк** і **Іаанна Галёнка** з Арэшкава, **Лукаш Пракапюк**, **Ева Янцэвіч** і **Паўліна Мартынюк** з Новага Корніна. Віншуем!

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Хор імя Г. І. Цітовіча выступаў з аркестрам*

# Хор Цітовіча ў Гайнаўцы

З нагоды Міжнароднага дня жанчын 9 сакавіка ў Гайнаўскім доме культуры адбыўся „Канцэрт для Евы". Выступілі на ім гайнаўскія пераможцы X Фестывалю „Беларуская песня 2003" у Беластоку. На заканчэнне запрэзентаваўся Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк узнагародзіў хор ГДК, які на Фестывалі заняў першае месца. Павіншаваў ён гайнаўскія жанчыны са святам і прывітаў беларускіх гасцей. На гайнаўскі канцэрт прыбылі Станіслаў Буко — старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Тацьяна Кавальёва з Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і пасол РБ Павел Латушка з жонкай Наталляй. Удзельнікі хору ГДК выступілі ў адноўленым складзе і новых уборах. Затым белліцэісткі са „Знічкі" падзякавалі паслу Паўлу Латушку за камп'ютэр, які атрымалі ва ўзнагароду за першае месца на Фестывалі „Беларуская песня", уручылі букет кветак і праспявалі падрыхтаваныя апошнім часам песні. Пасля выступілі салісткі Маргарыта Карпюк і Эмілія Горбач ды фальклорны калектыў з Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча заваражыў публіку спевамі, танцамі і аркестрам. Гайнаўскай публіцы вядомы ён з ранейшых канцэртаў. Першы раз хор Цітовіча выступіў у ГДК звыш дваццаці гадоў таму. Даваў канцэрт некалькі гадоў таму, а ў 1999 годзе атрымаў дыплом I ступені на Міжнародным фестывалі царкоўнай музыкі. У мінулым годзе хор адзначыў 50-годдзе свайго існавання. Дзяржаўны народны хор створаны быў з невялікага хору з вёскі Вялікае Падлессе, што на Брэстчыне. Яго кіраўнік Генадзь Цітовіч, харавы дырыжор, фалькларыст, этнограф ездзіў па вёсках Беларусі і самастойна запісваў песні для харавога рэпертуару. У 1975 годзе хор узначаліў дырыжор і знаўца фальклору прафесар Міхаіл Дрынеўскі, які кіруе ім па сённяшні дзень. Рэпертуар складае беларускі аўтэнтычны фальклор, апрацоўкі беларускіх народных песень, творы беларускіх кампазітараў і царкоўная музыка.

— Наш хор спяваў царкоўныя песні яшчэ пры Савецкім Саюзе. Добра ведаем Гайнаўку, давалі канцэрты і ў іншых гарадах Польшчы. Калі ехалі ў замежную краіну, бралі спецыяліста і вывучалі песню на мове гэтай краіны. Карэйцы хвалілі нас, што добра ведаем іх мову. Можам заспяваць і на польскай мове, — заяўляе прафесар Міхаіл Дрынеўскі. — У Польшчу прыехалі толькі 48 членаў хору, а ўсіх нас — 145.

Народны хор Рэспублікі Беларусь выступаў у многіх еўрапейскіх краінах, Кітаі, Канадзе і Карэі. У 1983 годзе хору прысвоена званне „Акадэмічны", а ў 2002 атрымаў статус „Нацыянальны". На гайнаўскай публіцы вялікае ўражанне зрабілі моцныя галасы мінскіх салістаў.

Аляксей Мароз

# Пушча — якая будучыня?

„Часам трэба паехаць далёка, каб дацаніць блізкае", — сцвердзіў Стэфан Якімюк з Сусветнага фонду прыроды на сустрэчы з доктарам інжынерам Андрэем Бобцам, аўтарам кніжкі „Белавежская пушча — якая будучыня?", які паўгода працаваў стыпендыстам у нацыянальных парках ЗША. Мерапрыемства адбылося 6 сакавіка ў гайнаўскім Доме культуры. Прыняло ў ім удзел каля васьмідзесяці асоб, зацікаўленых ідэяй стварэння з Гайнаўкі „брамы ў пушчу".

Аўтар расказаў пра амерыканскі парк Адзірондак, да якога штогод прыязджае каля 10 мільёнаў турыстаў (у Белавежскую пушчу толькі 100 тысяч). Андрэй Бобец расказваў такія гісторыі, якія ў нас гучаць неверагодна. Напрыклад, адзін парк паўстаў у дваццатыя гады XX стагоддзя па ініцыятыве жыхароў акалічных мясцовасцей! Ці можна ўявіць сабе, каб у нас нехта запрапанаваў пашырэнне парку? У нас жа людзі баяцца, што нейкія страшныя ўлады „зачыняць іх у рэзервацыі". Не ведаю, адкуль такі страх, калі ва ўсім свеце мясцовасці, што ляжаць пры ўездзе ў нацыянальныя паркі, гэтак званыя мясцовасці-брамы, багацеюць і развіваюцца. У турызме знаходзіць працу шмат людзей. Ахова прыроды выкарыстоўваецца там для развіцця навакольных мясцовасцей. У Апалачах вядзецца адбудова вёсак канца XIX стагоддзя, якія пасля дзейнічаюць як скансэны, а нават „культурны выпас коней". Амерыканцы мусяць над сваёй спадчынай працаваць — аднаўляць тое, чаго ўжо няма, а ў нас гэта ўсё ёсць, у нас гэта жыве! Тым часам мы, замест выкарыстоўваць сваё багацце, сварымся і глядзім спакойна, як нашыя найбольшыя козыры адыходзяць у нябыт — адміраюць вёскі, забываецца традыцыя, а першабытная пушча ператвараецца ў звычайны лес — такі, якога поўна і ў Польшчы, і ў Еўропе.

Пасля кароткага прадстаўлення зместу кніжкі і дэманстрацыі слэйдаў, пачалася гарачая двухгадзінная дыскусія. Відаць, што тэма пушчы зусім нам неабыякавая і ўвесь час выклікае вялікія эмоцыі. Найчасцей выказваліся людзі сярэдняга ўзросту, якія вельмі клапаціліся аб будучыні маладых. А маладое пакаленне не было дастаткова адважнае, каб адазвацца. У рэшце рэшт слова ўзяла вучаніца трэцяга класа ліцэя Маргарыта Карпюк. „Голас маладых" патрабаваў ад дарослых пашаны для пушчы, бо „на яе не можна глядзець толькі як на штосьці, з чаго выцягваецца як мага больш грошай — трэба памятаць, што гэта частка нашай культурнай спадчыны і трэба любіць яе". Зусім нечакана словы ліцэісткі выклікалі... апладысменты! Усё такі ўжо праз момант саракагадовы мужчына з іроніяй адзначыў, што „пані напэўна яшчэ сама на сябе не працуе, а любові да пушчы не дасца ўкінуць у гаршчок". Гэта, мушу прызнацца, засмуціла мяне! А я дакладна так хацела ў будучыні зарабляць! „Любоў да пушчы" прыехала б да мяне ў выглядзе турыста, пакінула б свае грошы, а я „ўкінула б іх у гаршчок". Зрэшты, не толькі я, бо сярэдні (?) турыст пакідае свае грошы не ў адным, а, скажам, у дзесяці месцах — хоча ён не толькі з'есці, выпіць, паспаць, але і пабачыць нешта цікавае, праехаць па лесе на возе, у аглоблі якога запрэжаны конь. Адзінае, што нам астаецца, гэта заахвоціць турыста, каб прыехаў дакладна да нас, а не ў іншы нацыянальны парк.

Каб Белавежская пушча надалей асталася апошнім натуральным лесам Еўропы, патрэбная лепшая ахова — ахова, ад якой бароніцца старэйшае пакаленне. Такім чынам самі сабе ствараем бязвыхадную сітуацыю. З аднаго боку добра, што вырастае новае пакаленне... Каб толькі мы не навучыліся адсталасці і страху перад усім новым ад пакалення нашых бацькоў!

Зося Лемеш

# Новы „Год" на новы год

Пабачыў свет новы нумар гадавіка „Annus Albaruthenicus" („Год Беларускі"), выдадзенага Згуртаваннем „Віла Сакратас" у Крынках і яго творцам Сакратам Яновічам. „Аннус" выдаецца ўжо чацвёрты раз і з кожным нумарам ён цікавейшы.

У гэты раз часопіс адкрывае тэкст на англійскай мове паэта і эсэіста з Познані Тамаша Агатоўскага, прысвечаны м.інш. глабалізацыі культуры. Таксама па-англійску гучыць тэкст беларускага палітыка, лідэра Беларускага народнага фронту Юрася Хадыкі (у перакладзе Івана Бурлыкі), які датычыць разумення беларускай нацыянальнасці ў кантэксце іншых нацыянальных ідэй. У сваю чаргу аб выконванні правоў і праблемах меншасцей і ўвогуле беларускай нацыянальнасці ў Польшчы піша па-англійску Майкл Флемінг, шматгадовы выкладчык Оксфардскага універсітэта, даследчык правоў нацыянальных меншасцей у Цэнтральнай Еўропе. Распавядае ён аб механізмах паглыбляючых спіхванне на палі беларускай меншасці, спасылаючыся на прыклад канфлікту за Белавежскую пушчу. Прытым сцвярджае, што новы еўрапейскі закон, які датычыць правоў меншасцей, не мае яшчэ свайго прымянення да беларусаў у Польшчы.

Прафесар універсітэта ў Беластоку Альжбета Чыквін у артыкуле па-англійску і па-беларуску аналізуе праблему тоеснасці праваслаўна-беларускай меншасці ў Польшчы. Прабуе ў ім адказаць м.інш. на пытанне, адкуль бярэцца падзел „Мы — праваслаўныя, беларусы; Яны — палякі, католікі". Таксама польска-беларускія суадносіны, толькі сцісла інтэркультурна, апісвае сацыёлаг Універсітэта імя М. Кюры-Складоўскай у Любліне Рышард Радзік. Яго артыкул канчае аналітычна-публіцыстычную частку гадавіка, з ускраіны, а час ад часу і з-за свету літаратуры.

Частку літаратурную і крытычна-літаратурную адкрывае тэкст беларуса Арсеня Ліса, прысвечаны літаратуры заходняй Беларусі. Прафесар Універсітэта ў Лондане Арнольд Макмілін з сапраўды брытанскай галантнасцю кампліменціруе творчасць Надзеі Артымовіч („адметная і незвычайная паэтка").

Чарговы „Annus Albaruthenicus" публікуе таксама фрагменты перакладу на беларускую мову „Дон Кіхота Ламанчаскага" Мігеля Сервантэса. Здзейсніў яго Якуб Лапатка, які намерваецца перакласці цэласць да 2006 г., значыць, к чатырохсотгоддзю публікацыі першай часткі рамана. У сваю чаргу таксама з іспанскай Валеры Буйвал пераклаў „Цуд святога Антонія", расказ Вінсента Бласка Ібаньеса. З італьянскай пераказаў ён два „Рымскія расказы" („Ненармальны" і „Паяц") нарыса Альберта Маравіі.

Сярэдняму чытачу, хоць зацікаўленаму беларушчынай у шырокім значэнні, цяжкавата будзе прабіцца праз артыкул Андраша Зольтана аб беларуска-венгерскіх сувязях. Гэта толькі таму, што ён (пра што можна даведацца з абшырнага рэзюме па-польску) публікаваны на венгерскай мове. Лягчэй ужо перайсці праз артыкулы гісторыка Андрэя Катлярчука аб беларуска-шведскіх адносінах ці Пятра Сівэцкага аб беларуска-татарскай пісьменніцы Тамары Болдак-Яноўскай. Абодва матэрыялы паказаліся на мове больш чым венгерская папулярнай у Еўропе — на англійскай, падобна як публікаваныя кароткія апавяданні Т. Болдак-Яноўскай (у перакладзе якраз вядомага эсэіста Пятра Сівэцкага). Для знаўцаў французскай і грэчаскай моў прапануецца вершы грачанкі Марыі Стамаці. Вельмі цікавыя вершы публікуе ўспомнены на пачатку Тамаш Агатоўскі, у перакладзе на беларускую мову Алеся Чобата: „Я меншы брат Слова".

Аб усім, што змяшчае ў сабе чарговы нумар „Annus Albaruthenicus" немагчыма ўспомніць. Аднак, вядома, што ў больш за трохсотстаронкавым штогодніку ёсць што і шмат пачытаць. Гэта, здаецца, найлепшы камплімент. Хоць, калі б хацець дакладна пазнаёміцца з кожным публікаваным тут матэрыялам, трэба валодаць, як добра палічыць, сямю мовамі. (холм)

# Смаляны на змяркані

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Касцёл дамініканцаў — на сценах выцвілі карычневыя лішаі*

На даху калгаса „Новае жыццё" ў Смалянах пачапіліся вароны. На галоўнай вуліцы, Віцебскай, не было жывой душы. Жыхары, быццам знарок, пахаваліся па хатках, панадворках. Толькі на сходках магазіна драмаў п'яны смалянец. Побач валяўся яго паабіваны ровар.

— Спіць як рыцар, седзячы, — прыкмеціў нехта з нашай кампаніі.

Думкі пра мінулае дыктаваў краявід мястэчка. Навокал, куды ні глянь, вышчараліся старажытныя руіны: зруйнаваны замак, шкілет касцёла, пашчэрбленыя муры царквы і кляштара.

На хаду ўзнікла ідэя — тут цікавы фон для прадукцыі фільмаў-жахалак.

* * *

— І ідэальнае месца для арганізавання рыцарскіх турніраў, — скажа той хто пабачыць замак „Белы Ковель". Стаіць ён у самым цэнтры мясціны, аднак дабрацца да муроў складана і небяспечна. Руіны замка аколены вадой і багнай. Мы доўга таўкліся ля берага ракі ў пошуках броду. Дапамог нам мясцовы хлопец, які вёў з папасу каня.

— Ёсць кладка і сцежка, — паказаў нам непрыкметнае для вока месца. Сцяжынай, між асакі і трыснягу, падсохлай балацявінай, мы дабраліся да гістарычных муроў. У хатцы, на другім беразе рэчкі, ламатала папса.

Замак пабудаваны на сыпанай пляцоўцы шырынёю 100-200 метраў. Як мяркуюць даследчыкі, узведзены ён да 1624 года, князем Сангушкам-Ковельскім. Муры з чырвонай цэглы і каменя пачаткова былі памаляваны ў белы колер. У сярэдзіне памяшканні мелі скляпеністыя перакрыцці, каміны, паверхі злучаліся маршавымі і вітымі ўсходамі. Жылыя пакоі гэтага рэнесанснага палацакрэпасці былі прыздоблены фрэскамі.

Першае пашкоджанне замка адбылося ў час Паўночнай вайны. На ацалелым корпусе відаць сляды гарматніх удараў. „Белы Ковель" канчаткова разбураны ў сярэдзіне XIX ст.

* * *

Смалянскі дэкаданс жыва адлюстроўваюць касцёл і кляштар дамініканцаў, помнікі барока другой паловы XVIII стагоддзя. На даху касцёла, у сярэдзіне растуць бярозы. На сценах выцвілі карычневыя лішаі, сыплецца тынк. На зямлі кучы друзу. Няма даху. Заняпад настаў у канцы трыццатых гадоў, калі касцёл разам з кляштарам аддалі пад управу калгаса. Наладзілі тут майстэрню і гаражы.

Як паведамляюць крыніцы — у 1899 г. касцёл і кляштар былі грунтоўна адрамантаваны. Пад кірункам архітэктара Даўкшы зроблены новыя алтары касцёла і вялікае люстра. Цэнтральны неф быў перакрыты цылінрычнымі скляпеннямі.

Будынак кляштара з панадворка напамінае свіран. Вакол распаўзлося і зашумела пустазелле. Пра мінулае гэтага аднапавярховага будынка калідорнай планіроўкі напамінаюць яшчэ цылінрычныя перакрыцці.

Смалянскі касцёл наведваў славуты паэт-рамантык, найпрамяністы Тамаш Зан, філамат і філарэт. Яго магіла знаходзіцца на мясцовых могілках.

* * *

Смаляны пазбаўлены гарадскіх правоў, зараз з'яўляюцца вёскай. Мясцовасць палохае занядбаннем, роспачу. У атмасферы жывы дух трагічнага досведу. Катастрафізм месца пабівае агульная звестка пра гібель 800 ахвяр фашызму.

— У 1942 годзе немцы расстралялі тут 800 мірных жыхароў, — інфармуе мемарыяльная табліца на брацкай магіле.

Смаляны вядомыя з XV стагоддзя. Росквіт мястэчка звязаны з атрыманнем магдэбургскага права. Захавалася апісанне з пачатку XVII ст. У цэнтры стаяла ратуша, паблізу двухпавярховая бажніца і гандлёвыя рады. Другую частку займалі жылыя будынкі. Залаты час і славу перажываў замак. На службу наймаліся рыцары Заходняй Еўропы.

Заняпад Смалян звязаны са стратай незалежнасці Вялікага княства Літоўскага.

Смерць мясціны павольная, цягнецца стагоддзямі. Яшчэ ў пачатку XX ст. тут былі тры цэрквы, царкоўна-прыхадская і сярэдняя гарадская школы, 40 крам, 4 гарбарныя і піваварныя заводы і 2,5 тысячы жыхароў.

У вёсцы будынак сельсавета, школа, бальніца і магазін. На школьным панадворку помнік Леніну.

* * *

Дзейнічае ацалелая цудам Спаса-Праабражэнская царква — помнік рэспубліканскага значэння. Пабудаваная ў палове XVIII стагоддзя ў стылі барока. Храм складаецца з дзвюх частак — мураванай ніжняй і драўлянай верхняй. У сярэдзіне легендарныя фрэскі — на купале 12 апосталаў размаляваных у поўны рост. Захавалася іх каларыстыка: на блакітным фоне святыя ў вохрыста-чырвоных, балотна-зялёных і залаціста-карычневых адзеннях.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Свята-Аляксандраўская царква ў аварыйным стане*

У канцы трыццатых гадоў, бальшавікі наладзілі ў царкве вінаробчы завод.

У аварыйным стане Свята-Аляксандраўская царква пабудаваная ў 1864 годзе. Чырвоны мураваны будынак разбураны і апаганены. Здалёк лёгка паблытаць з руінамі замка.

* * *

Кожны хто наведае Смаляны запамятае іх на ўсё жыццё. Найлягчэй зрабіць выснову — мястэчка мае свой час ужо за плячыма.

З другога боку, рэдка які гарадок захаваў так многа гістарычных помнікаў архітэктуры і культавых месц. Ці не дрэмле ў гэтым турыстычны патэнцыял, шанц на аднову атмасферы?

Але, пакуль што, тут можна здымаць фільмы-жахалкі, або ладзіць мерапрыемствы турпістам.

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Руіны замка ў Смалянах*

# Дараванне правінаў

У нядзелю прабачэння правінаў (9 сакавіка) у Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы епіскап Гайнаўскі Міран, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч і протаіерэй Славамір Хвойка гаварылі пра сапраўдны сэнс Вялікага посту, які не павінен абмяжоўвацца толькі да спажывання безмяснога і безмалочнага харчавання. У час Вялікага посту трэба пачаць аднаўляць душу адрачэннем ад грахоўных прывычак. Прапанавалася перастаць глядзець фільмы і грахоўныя перадачы па тэлебачанні, займацца з камп'ютэрам толькі па неабходнасці, а больш часу адвесці на малітвы, чытанне Евангелля і духоўнай літаратуры. У харчаванні трэба адкінуць тыя стравы, якія любім і абмежаваць колькасць яды. У час посту не павінны арганізавацца ўрачыстыя бяседы, а хрышчэнне дзяцей прапанавалася адтэрмінаваць да Велікоднага перыяду (за выключэннем хворых). Пакідаючы грахоўнае жыццё людзі не павінны вяртацца да асуджання бліжніх і з любоўю ставіцца да патрабуючых дапамогі.

Вячэрняе богаслужэнне, якое закончылася абрадам дараванне ўзаемных правінаў, узначаліў епіскап Міран. У пропаведзі сказаў ён, што духоўнае аднаўленне трэба пачаць з прымірэння з бліжнімі. Ад таго, як мы паставімся да бліжніх, будзе залежаць як Бог аднясецца да нас. Епіскап праінфармаваў аб малітвах праваслаўных грэчаскіх вернікаў за захаванне міру ў Іраку. Прасіў маліцца за захаванне спакою ў свеце.

У мінулым манахі, якія на час посту ішлі ў пустэльні, уладжвалі свае непаразуменні. Гэты звычай захаваўся ў праваслаўных прыходах па сённяшні дзень. У Гайнаўскім саборы гэты абрад упершыню быў разбудаваны. Сабраліся свяшчэннікі ўсіх гайнаўскіх прыходаў. Пасля вячэрніх малітваў усе святары разам з дыяканамі і іпадыяканамі выйшлі да вернікаў. Епіскап Міран першы папрасіў прабачэння правінаў і пакланіўся перад сабранымі. Пасля святары падыходзілі адзін да аднаго і прасілі дараванне ўсяго, што дрэнна зрабілі або падумалі ў адносінах да другога свяшчэнніка. Калі да святароў пачалі падыходзіць прыхаджане, епіскап Міран трымаў у руках Евангелле, мітрафорны протаіерэй Міхаіл — Крыж Гасподні, а ўсе іншыя — іконы з часціцамі мошчаў. Вернікі і святары прасілі ў сябе дараванне правінаў. Некаторыя вернікі перад выхадам з царквы падыходзілі да сваіх знаёмых і таксама звярталіся з прабачальнымі просьбамі.

Аляксей Мароз

Фота ВІКТАРА БУРЫ

*Дэлегаты (злева): Сабіна Ажахоўская, Зінаіда Буйноўская і Уладзімір Баўтрамюк*

# Былі маладымі

Засерабрылася 25 лютага г.г. зала н-р 12 Гарадской управы ў Гайнаўцы. У гэты дзень праходзіў у ёй справаздачна-выбарчы з'езд Раённага аддзела Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў, які падвёў вынікі працы гэтай арганізацыі за 1998-2002 гады. Старшыня аддзела Мікалай Чыквін прывітаў прадстаўнікоў улад і дэлегатаў, якія прадстаўлялі 700 пенсіянераў Гайнаўшчыны. Сярод 24 дэлегатаў былі адстаўныя настаўнікі, лекары, рабочыя колішніх фабрык і прадпрыемстваў (Хімічная, Тартак) — адным словам ветэраны працы.

Са справаздачы старшыні вынікала, што члены „саюза старэйшай моладзі", бо так сваю арганізацыю жартаўліва яны называюць, нягледзячы на пажылы ўзрост і марнае здароўе, дзейсна дапамагалі сябрам. 157 членаў СППіІ пакарысталіся дапамогай на суму амаль 13 тысяч зл., 145 асоб атрымалі харчовыя пачкі, а 34 хворых — грошы на выкуп лякарстваў. У перыядзе 1998-1999 з выпадку 80-годдзя 40 згуртаваных у СППіІ пенсіянераў з мінімум 10-гадовым членскім стажам атрымалі рэчавыя сувеніры. Праўленне Раённага аддзела СППіІ дзейнічае пад лозунгамі: „Дапамагайма сабе самі" і „Барацьба са старасцю і адзіноцтвам". Свядомасць таго, што дзеячы Саюза пенсіянераў і інвалідаў чыняць дабро, вызваляе ў іх новыя сілы, ініцыятывы і запал да працы.

У культурна-забаўляльнай галіне аддзел сарганізаваў 13 краязнаўчых экскурсій, 9 выездаў у Пружаны, 25 пікнікаў за горадам, 49 танцавальных вечарын, 12 навагодніх мерапрыемстваў, 17 святкаванняў Дзён сеніёра і па 7 канцэртаў мясцовых і пружанскіх народных калектываў. У экскурсіях удзельнічалі па 40-46 чалавек (столькі пасажыраў змяшчае аўтобус), а на іншыя мерапрыемствы збіралася па 80-120 чалавек. Паспяхова вядзецца культурны абмен з падобнымі арганізацыямі ў Бельску і Гарадку. Па ініцыятыве Гайнаўскага аддзела адбыліся супольныя выезды вузкакалейкай у Тапіла, мерапрыемствы тыпу прывітанне вясны, развітанне з летам ці пячэнне бульбы.

Але не толькі аднымі мерапрыемствамі жывуць пенсіянеры. Крыўдавалі яны на скарачэнне ўладамі сацыяльных прывілеяў (аднялі ў іх льготы на санаторыі і лякарствы), што прычыняецца да збяднення гэтай групы грамадства.

Старшыня адзначыў, што дзякуючы падтрымцы пенсіянераў 8 асоб былі выбраны раднымі і цяпер займаюць высокія пасады ў горадзе і павеце. Паабяцалі яны сабраным, што па сіле магчымасцей будуць старацца дапамагчы гэтай высакароднай арганізацыі.

Дэлегаты падзякавалі кіраўніку Цэнтра дапамогі сям'і Паўлу Шыманюку за аказаную падтрымку і дапамогу ў дзейнасці арганізацыі. У сваю чаргу старшыня Акруговага аддзела СППіІ з Беластока Ян Каліноўскі высока ацаніў актыўнасць Гайнаўскага аддзела, кажучы між іншым: „Ва ўсім ваяводстве няма так вялікага і дзейснага аддзела, як у Гайнаўцы".

Выступаючыя ў дыскусіі дэлегаты станоўча ацанілі працу старшыні Мікалая Чыквіна і перавыбралі яго на другі тэрмін.

Ніжэйпажпісаны жадае пенсіянерам і пенсіянеркам: ад блізкіх — моцнага кахання, ад Бога — здароўя, ад сонца — цяпла, а тады кожны дзень святам будзе.

Віктар Бура

Фота ВІКТАРА БУРЫ

*Мікалай Чыквін — старшыня Гайнаўскага аддзела СППіІ*

**Нашы чытачы**

# Мікола

Пералічвае Мікола Петышук радню, што на здымку. І тых, каго няма. Мама Таня, тата Грыша, дзеці — Грыша (1927), Коля (1929), Вася (1932), Пеця (1935), Толя (1937) і маленькая Валя (1942). Цяпер тая Валя, у якой жыве, ягоная адзіная апякунка. Каб не яна, Валянціна Якімчук, 72-гадовы Мікола Петышук, пасля ўдару, напаўпаралізаваны, не справіўся б з жыццём. Сам застаўся быў у Чаромсе, пасля смерці жонкі. Неяк даваў сабе рады, упраўляўся, гаспадарыў, рабіў агародчык. Ды цяжка нямогламу мужчыне. Хатка засталася, як стаяла. І радзінная хатка ў Хлевішчах адна... Мікола паехаў да сястры ў Беласток. І так тэпае памалу па хаце, чытае „Ніву" і беларускія кніжкі, сам спрабуе запісаць свае ўспаміны. Чакае, калі Валя вернецца са свае працы ў кавярні. Там робяць па 16 гадзін, і Валя, каб забяспечыць брата на той дзень, калі працуе, рыхтуе ўсё, гатуе, каб брат памаленьку справіўся. Бо і рука левая ў яго безуладная, і нагу ледзь валочыць — карыстаецца спецяльнай кульбай на трохножку...

Усе браты, як усе нашы хлопцы пасля вайны, паразбягаліся па свеце, шукаючы свае долі. І Мікола, якога ўзялі ў армію ў Яленю-Гуру, у самастойны батальён сувязі, пасля думаў застацца ў войску. Трапіў у Дэмблін, у афіцэрскую школу пілатажу. Быў там да 1954 года; калі скончыўся канфлікт з Карэяй, Коля паехаў дахаты. Ужо з жонкай Нінай (сын Славік нарадзіўся ў 1951 г.). Як адукаванага, добра паказваючага сябе маладога чалавека, сталі пасылаць яго ў грамадскую службу. На радзіму сцягнуў яго Севастыян Маркаў. Мікола стаў старшынёй гмінай рады, пасля (у 1955 г.) у Гайнаўцы ў павятовай радзе кіраўніком самастойнага рэферата па працаўладкаванні, інструктарам. У 1956 г. перанёсся на чыгунку, далей — у пажарнікі. У Чаромсе быў кіраўніком пажарнай службы аж да 1973 года. Зноў стаў чыгуначнікам — спачатку памочнікам, пасля машыністам — у 1989 годзе перайшоў на пенсію. Ніна памерла ў 1994 годзе (на 64 годзе жыцця). Пустуе цяпер іхняя хата ў Чаромсе — пабудаваная ў 1963 г. Стаіць і хатка ў Хлевішчах — сюды час ад часу з'язджаецца ўся радня...

Мікола Петышук з вялікім хваляваннем чытае „Ніву". Валянціна купляе яе ў чацвер, прыносіць дадому. „Божа, што там у нашай каханай «Ніўцы», — у вачах яе брата часам і слёзы паказваюцца. Чытае шмат. Валянціна набывае яму новыя беларускія кнігі на святах беларускай культуры. Так мы і пазнаёміліся — спадарыня Валянціна, прыгожая, ветлая бландзінка, набывала кнігі ў Яна Заброцкага і „белавежцаў" і прасіла, каб яны падпісвалі іх яе брату Міколу. Прызналася, што ён нямоглы. А кніжак прагне, як каня вады. Бо яны цяпер яму засталіся, заўсёды рухаваму, энергічнаму, прыгожаму чалавеку, закаханаму ў жыццё, зямлю. І сам ён прыгожа ўмее напісаць. Цяпер чытае Максіма Гарэцкага. І ўспамінае. І чакае новага нумару „Нівы", у якой пішуць пра роднае.

Міра Лукша

*Мікола Петышук у Дэмбліне, 1950 г. Можа, застаўся б у арміі... Тады не вярнуўся б на Беласточчыну?..*

*Пад хаткай у Хлевішчах. Сядзіць бацька Грыша. Злева — мама Таня, Валя, Пеця, за ім Толік. Няма — Колі (быў у арміі), Васі (быў на вучэннях у Радаме; загінуў у аварыі) і Грышкі.*

**Еўрасаюз, як ты мне мілы...**

# Будзе добрае

Я свінак у сваім жыцці не карміла. Дык слухаю ўважна вясковых кабет, як гадуюць сабе свінак на свята.

Мы тых парасятак, расказвае адна жанчына, што гадуем сабе, ставім асобна. І кормім не абы-як. Усё сваё: бульбачка, асыпка з ячменю, аўса, пшаніцы, ды і ад стала, калі што застанецца, у карыта ўкінем. Мяска тады далікатнае, мякенькае, а зварыш яго — дык аж пахне.

Што вы, тое мяса, што на продаж, яго ў рот не возьмеш: без смаку і цвёрдае. Чаму? Бо тых парасят мы кормім канцэнтратамі, каб раслі хутчэй. А як хтось не бачыў лепшага мяса, дык і тое яму добрае будзе.

Слухала Ада Чачуга

# Душпастырства ў НАТА

31 сакавіка ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку (вул. св. Мікалая 5) з дакладам на тэму „Роля вайсковага душпастырства ў дзяржавах НАТА і славянскіх краінах" выступіць праваслаўны ардынарый Войска Польскага епіскап Міран. А 14 красавіка лекцыю на тэму „Праваслаўе ў сучасным свеце, з асаблівым улікам Еўрасаюза" прачытае а. д-р Генрык Папроцкі. Пачатак а гадз. 18-й. (яц)

# Вер – не вер

Мілы Астроне! Ізноў мне сняцца нейкія дзіўныя сны. Вось быццам стаю я перад сцяною нейкага дома, высокага, у два паверхі. Акон на гэтай сцяне няма. Нехта кажа, што там жывуць цыганы. Не баюся і ўваходжу ў гэты дом. Як тут прыгожа! Пасярэдзіне стаіць накрыты для гасцей стол. На ім — закуска. Ведаю, што будзе абед. На камодзе ля стала бачу шмат кавалачкаў матэрыі. Яны, напэўна, засталіся, калі нешта тут шылі. Трэба ж іх выкарыстаць.

Раптам перада мною паяўляецца вельмі прыгожы хлопчык гадоў дзесяці. Бландзінчык, у блакітна-зялёнай вопратцы. Мы пачынаем з ім нешта рабіць з гэтых рэштак матэрыялу. Я яму паказваю, як можна пашыць з гэтага нейкую вопратку для лялек ці мядзведзікаў, і мы разам пачынаем майстраваць тую адзежу, хаця цацак ніякіх не было тут відаць, а былі толькі тыя кавалачкі матэрыі.

Я ведаю, што гэта цыганскі дом, але зусім не адчуваю тут ніякай іншасці. На стале ляжыць прыгожы абрус, усё пададзена, як на свята. Калі толькі прыйшоў гаспадар дома, я перастала займацца тымі анучкамі, а пачала падаваць да стала розныя прыправы ў бутэлечках, каб кожны мог сабе падправіць страву. Людзей за сталом я не бачыла. Так я падавала тыя прыправы і прачнулася. Нядобры сон, га, Астроне?!

Алена

Алена! Сон вельмі цікавы, але сведчыць аб цяжкасцях у тваім жыцці. Аб іх гаворыць тая сцяна, мур, які стаяў перад табою. А за мурам — цыганскі дом. Няўжо здрада ў каханні? Не, там жа зусім не адчуваецца не толькі варожасці, але і іншасці. Усё так, як і ў нас. Прыгожанькі хлопчык, кавалачкі матэрыі, з якой вы хочаце нешта пашыць лялькам ці мядзведзікам сведчаць пра тое, што замест вялікага і выгаднага падарожжа ты зможаш выкарыстаць і малыя магчымасці — такія, на якія дазваляе жыццё. Добра і тое, дальбог, кажу табе. Відаць, што ў цябе гэта выйдзе, як выйшла пры сшыванні гэтых ласкуткоў. Жадаю самага добрага!

Астрон

# Грош на грош

Пры санацыі ў ваколіцах Заблудава, Нарвы і Міхалова ездзіў жыд Ісак, які купляў свіней. Ён заўсёды гаварыў: „Я не хачу зарабіць злот на злот, хопіць мне грош на грош, тады будзе добра".

Напрыканцы студзеня на пунктах скупкі плацілі за свініну ў сярэднім 2,80 зл. за кілаграм. Але мясныя вырабы анічуць не танеюць. Вось, напрыклад, крывянка, г.зв. „крупнёкі", у якой толькі адна каша ды кроў, каштуе 6 зл. за кілаграм, молатае сала з прыправамі ў фольгавай кішцы таксама — 6 зл. Лепшая каўбаса ці кумпяк — гэта ўжо выдатак каля 20 злотаў за кілаграм.

У колькі разоў больш зарабляюць цяпер мясакамбінаты, чым грош на грош? А ўсё роўна абанкручваюцца і ўпадаюць, а іхнія дырэктары... плаваюць у дастатку. Шкада, што нашы ўлады на ўсё гэта прыплюшчваюць вочы.

Мікалай Лук'янюк

# У „куфляндыі"

У Дубяжыне працуюць тры крамы. Адна кааператыва ГС і дзве прыватныя. Кааператыўная знаходзіцца ў вёсцы, а прыватныя на ўскраіне, у колішняй школе. Дубяжынцы назвалі гэтае месца „куфляндыяй", бо пастаяннымі кліентамі гэтых крамаў з'яўляюцца аматары піва.

— Гэта кашмар для жанчын, — гаварыла мне сяброўка. — Мой мужык амаль усю пенсію там пакідае. Заходзіла неаднойчы і прасіла прадаўшчыцу не даваць мужыку піва ў крэдыт, але тая не паслухала.

У „куфляндыі" адно апівохі збіраюцца і паразіты, якія падвыпіўшых мужыкоў даглядаюць, каб ім з кішэні апошнюю залатоўку свіснуць.

А мо б так участковы час ад часу заглянуў у „куфляндыю"? (ус)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Мікола і Міхал Кобацы перад новабудаванай аборай*

# Кленіцкія жывёлаводы

Мікола Кобац з Кленік з сынам Міхалам гаспадараць на больш за 60 гектарах зямлі, гадуюць 32 каровы і 17 ялавак. Зараз будуюць вялікую абору і намерваюцца пабольшыць гадоўлю кароў.

— У старой аборы стаяць 23 каровы, іншыя — у хлявах і клуні. Плануем удвая пабольшыць статак кароў. Гэты год — рэферэнцыйны. Нам трэба прадаць як найбольш малака. Сыну, як маладому гаспадару павінны дазволіць на большую вытворчасць малака, — кажа Мікола Кобац. — Добра, што нявестка згаджаецца гаспадарыць, бо не ўсе маладыя хочуць заставацца на вёсцы.

Новая абора будуецца непадалёк ад вёскі. Уражвае яе велічыня. Побач аборы ляжыць корм. Хацелі закончыць будову перад маразамі, але не ўдалося, бо зацягнуліся будаўнічыя работы. Галоўныя працы ўжо завершаны. Сцены абліцаваны глазурай і тэракотай. У Еўрасаюзе патрабуюць, каб у аборах добра змываліся сцены і падлогі. Плануецца, што 44 каровы, якія апынуцца ў аборы, можна будзе выдаіць за гадзіну. Збоку будзе месца для 30 ялавак або цялят. У аборы няма акон, толькі часткова светлы дах. Кошт будовы аборы — 600 тыс. зл. Міхал Кобац можа пакарыстацца крэдытам для маладых гаспадароў размерам у 480 тыс. зл. на невялікі працэнт (каля 1,5% гадавых).

— Пакуль мы рашыліся будаваць абору, прыглядаўся я да гадоўлі кароў ў Галандыі, Нямеччыне, ездзіў на Сельскагаспадарчы кірмаш у Познань і Беласток. Чытаем прафесійную літаратуру па малочнай прадукцыі, — заяўляе Мікола Кобац. — Ад 20 гадоў прыязджае да нас заатэхнік, які ацэньвае малочнасць кароў і іх здароўе. Да гэтай пары ў 99% нашае малако прадавалася ў класе экстра. Зараз малавата плацяць за малако. Апошнім часам па 88 грошаў за літр, але няма выхаду і трэба развівацца.

У спадарства Кобацаў ахвотна купляюць ялавак, бо можна спраўдзіць іх радаслоўе і даведацца колькі малака давалі яны і іх маткі на працягу многіх гадоў. Зараз статак у 90% складаюць каровы гольштэйн-фрызійскай пароды. Дайшлі да гэтага шляхам крыжавання парод. Для гаспадарчых патрэб прыдбалі яны чатыры трактары і машыны да ўборкі травы і выконвання з яе сіласаў. Каб накарміць цяперашні статак, трэба за лета падрыхтаваць 500 бэляў сіласу ў фольгавай упакоўцы. Трэба таксама многа збожжа. Землі вакол Кленік добрыя, пшанічныя. У спадарства Кобацаў пшаніцу ўбіраюць сваім камбайнам.

Аляксей Мароз

# Асцерагальны знак

Дарога з Дубна ў Нурэц. На абочыне пакалечаная таполя, на ёй вянкі, а перад ёю — лампадкі. Апошняй восенню ехаў па гэтай дарозе аўтамабіль, ехаў размашыста, запыніла яго дрэва. Шафёр не дажыў да шпіталя; пасажыру, які ляжаў на заднім сядзенні, нічога страшнага не сталася...

Калі ў лютаўскі падвячорак праходзіў я бачным адрэзкам дарогі, каля месца выпадку спынілася легкавушка, выйшлі з яе тры асобы, у іх ліку двое дзяцей ва ўзросце да дзесяці, запалілі лампадкі, паехалі дадому.

Шафёр, здавалася б, нікому крыўды не зрабіў, сам жа ён расплаціўся за сваю размашыстасць. Але тым дзеткам, якія ставілі лампадкі, не быў ён, відаць, абыякавым. Ад жыхароў згаданых вёсак даведаўся я, што завёў ён вялікую жывёлагадоўчую ферму, пастаўленую мабыць за крэдыт. І цяпер ягоная жонка ломіць галаву, як справіцца з гэтай нечаканасцю...

Яго аўтамабіль мог трапіць, заміж у дрэва, у нейкага прахожага або ў іншы аўтамабіль. І было б не менш бяды, сваёй і чужой.

Добра было б, каб шафёры, сядаючы за руль, забіралі з сабою не толькі хвацкае фантазіраванне, але і цвярозае, бывай бацькоўскае, уяўленне.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА


**Ніва** ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Мірановіч.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (0 10xx 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

***Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.***
**Галоўны рэдактар:** Віталь Луба.
**Сакратар рэдакцыі:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

# Н!ўка

*— Трошку пазней, зараз у нас госці...*

**Факты і высновы**

## Міхнік — мовазнаўца

— *Jak się rozmawia z Anglikiem, to się rozmawia po angielsku. Jak z Rywinem, to po Rywinemu*, — падкрэсліваючы сваю бываласць і адносіны да сродка чалавечых зносін, заявіў Адам Міхнік.

Няўжо, прыціскаючы кампанніка да сценкі, намякаў на паляшуцкую гаворку? (Рывін нарадзіўся і падрастаў у Пінску). Дык палешукі і з англічанамі гавораць на сваёй мове. Толькі адкуль яе ведае Міхнік? Ах, каб цябе ваўкі з'елі, ведаю хто стаіць за Рывіным! Але не скажу.

## Украіна блакітнее

На Украіне аднавілася крыніца высокай крыві. Адкрыў яе Юліюш Навіна-Сакальніцкі, выхадзец з колаў польскай эміграцыі ў Лондане. За 500 долараў прымае ён у Ордэн святога Станіслава і адначасова прысвойвае шляхоцкі тытул. Ужо 300 асоб узвысакародзіла сваю кроў. Сярод іх былы прэзідэнт Леанід Краўчук і жонка цяперашняга прэзідэнта Людміла Кучма.

Беларусы традыцыйна адстаюць.

## Адкрыццё

Пасол Самборскі (ПСЛ) грымнуў на ўсю Польшчу: — *Polacy nie znają genezy swoich barw narodowych!*

Відаць і сам не знае, інакш — навошта абагуліў?

Сідар Макацёр

# *Адгаданка*

## *Нетутэйшыя і тутэйшыя*

(анаграмная шарада)

*За трыдзевяць зямель,* ***І*** *рэк,* ***І*** *гор,*
*За морам, што в'е аб бераг хваль* ***БЯЛКІ***
*Быццам тугі салёных слёз прыбой;*
*Чужых яны абарыгенаў, быццам прымакі.*
*Не роскаш ці капрыз загналі іх туды*
*І не гарачыня касмічных летуценняў —*
*Іх душ крыніцы, быццам* ***ЛЁД ЯКІ***
*Скавалі кіпцюры чужацкага ганення.*
*Адлігі кволай падышло імгненне*
***А З*** *ёю парасткі жывой руні*
*Вынеслі ў свет другое пакаленне...*
***І тут яны, і ў казачнай далі.***
**Д-7, І-1, Б-7.** (Ш)

Разшэннем адгаданкі з'яўляецца загаловак кнігі Яна Чыквіна аб пазасавецкіх беларускіх літаратарах. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Рашэнне адгаданкі з 6 нумара**

Паліндрам, які трэба было ўстанавіць — **А ліса насіла**.

Кніжную ўзнагароду высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

# Роздумы ў ложку

„Прыходзіць баба да лекара з гіпсам на назе. — Што з вамі? — Ударылася я ў галаву! — Ну, як гэта так? Дык чаму гіпс на назе? — Звычайна, абсунуўся!"

Гэтак я азваўся да мае Агаты, як якраз утыкала мне пад паху градуснік. Адхілілася так ад мяне, што галавою ўдарыла ў мой падбародак. Прыкусіў я язык, але гаварыць не перастаў.

Захварэў я, вось, прастыў. Ці то грып які прычапіўся. Усе хварэюць — хопіць, што ў аўтобусе хтосьці ўжо заражаны кашляне, дык мікробаў мільёны распырсне. Паходзіш такі апырсканы, і зляжаш у пасцель. А калі ты там, дык не толькі лякарствы патрэбны, але і добры настрой. З хваробай трэба змагацца таксама і псіхічна. Дык я гавару Агаце анекдоты. І сам сябе рассмяшаю, так ці не?

— Перастаў бы. Мікробы распаўсюджваеш, рот разявіўшы. І мне зусім нясмешна. На псіхіку мне ніяк не дзейнічаеш, — прасіпела Агата і абсунулася на канапу, падцягнуўшы клятчаты плед пад бараду — да яе таксама падступала хвароба.

Дык я зноў пачаў:

„Прыходзіць пацыент да псіхіятра і кажа: — Пан доктар, мне сняцца ў апошні час дзіўныя сны. Сніцца мне, што я п'ю каву, а на канец з'ядаю і кубачак, пакідаю толькі вушка. — Ну, дык гэта сапраўды дзіўная справа — якраз вушка ў кубачку найлепшае!"

Агата неспакойна заварушылася на канапе.

— Ты што, Вандал, як не пра бабу, дык пра псіхаў? Мабыць, смяшнейшых тэмаў няма? Кхе-кхе-кхе! Аж зубы баляць ад таго ўсяго твайго „смешнага"!

— Ну, дык зубныя справы. „Сядзіць пацыент у дантыста: бураванне, пламбіраванне, бураванне... Справа працягваецца, дык пацыент кажа: — Пан доктар, можа, зробім перарыў на цыгарэту? — Доктар раз — схапіў шчыпцы і вырваў пярэдні зуб".

Агата памаўчала хвілю, высмаркалася ў папяровую сурвэтку і раптам уцяміла, зарагатала.

— Ну, чорны гумар.

— Не такі і чорны, бо зуб быў здаровы, белы. Хочаш чарнейшы? „Прыходзіць баба да лекара. — Пан доктар, не магу хадзіць, не магу ляжаць, не магу сядзець! — А вісець вы яшчэ не спрабавалі?"

— Зноў пра бабу, і то так, бы тыя бабы былі тваімі найбольшымі ворагамі! — Агата спусціла ногі з канапы. — Хварэць адхочацца.

— То не хварэй. Прынясі мне, Агатка, ананас. Не, цягне мяне на сялёдку з цыбулькай... Ну, давай... „Пацыенту далі перад аперацыяй наркоз. Калі прабудзіўся, здзівіла яго, наколькі пастарэў твар нахіленага над ім лекара. — Дык што, я столькі часу быў непрытомны? Вам, пан доктар, за той час паспела вырасці доўгая сівая барада! — Я не доктар, я — святы Пётра!"

Агацін чырвоны ад гарачкі твар напурпурыўся яшчэ больш. Далажылася і яна:

„Прыходзіць мужык да лекара. Доктар, як то доктар, даследуе яго гадзіну, пасля чаго кідае нейкі спецыялістычны тэрмін. Пацыент няўпэўнена пытаецца: — Пан доктар, гэта пяройдзе? — Так, на жонку і дзяцей".

— А калі абое станем адразу перад святым Пятром? — распэрхаўся я. — Дык што ад нас тутака застанецца?

— Папытайся ў чытачоў.

Вандал Арлянскі

# Халодная справа

Сандар Жоржавіч з неспакоем глядзеў на апусцелую паляну. Тым больш, што хіліла яго на спознены зімовы сон. Сам адмяніў быў прынцыпы свайго мядзведжага жыцця, усё дзеля кар'еры, каб у адпачынак падавацца летам, у мёртвы сезон, калі ледзь не ўсе ўселясныя і іншыя ўстановы і прадпрыемствы робяць на паўкатушкі, распускаючы сваіх супрацоўнікаў на канікулы. А тут што натварылася? Нават хутканогая і рахманая лань спазняецца, нават пільнага Стукача духу не чуваць!..

Як ні дзіўна, першай паявілася вавёрка Кацюша, трымаючы ў левай і правай лапе па арэху.

— Чаму прадстаўнікі спазняюцца?

Кацюша, каб не адказваць, засунула ў рот арэх з левай лапы.

— Вы арэхамі, Кацька, не затыкайцеся. Чаму няма савета?

Вавёрка раскусіла арэх, адплюнула шкарлупіну, схрумстала ядро і свіснула:

— Ат і свіснула я. А яны, мабыць, свішчуць сабе, раяцца...

— Рада ж тут! Хто ім даў дазвол збірацца ў іншым месцы! Хіба ж яны не ва Уладзімірскім лесе?! А, можа, да вужа Ззянона ці змяі Ссапіі падаліся? За колькі прадаліся грантасрэбнікаў?

Кацюша сцепанула плячыма.

— Якія срэбнікі? Арэхі, дык я разумею, хай бы і замежныя.

— Дзе ваша свядомасць, Каценька?! У вашай моладзевай арганізацыі, здаецца, вас не навучылі патрыятызму? „Наш лес — наша зеленавокая бацькаўшчына, мацькаўшчына, сынаўшчына і даччынаўшчына, цёткаўшчына і дзядзькаўшчына, дзедаўшчына і бабаўшчына..." Хто не з намі — не наш ён. А хто вякне па-ўладзімірску!..

— Ой! — віснула Кацюша і ўпусціла арэх з правай лапы. — Мы ж перавялі вавёрчыны школы на ўсеўладзімірскую праграму! Праўда, нам больш адпавядала б верхагалінная, ды ўсе ўжо перабудаваліся...

— Зноўку перабудуемся. Хто не навучыцца — прэч з галіны. Хай ападкі збірае. Або — за скурку і вон з нашага роднага лесу!

— На ўсход ці на захад? — дачуў апошняе Стукач, які якраз падляцеў і расклеіў дзюбак, прысеўшы на пяньку насупраць Сандара Жоржавіча.

— Гэта залежыць ад таго, як сядзець.

— А я думаў, што — ад компаса, — навукова ўключыўся, чухаючыся аб хвойку, Свіналыч. — І ад надвор'я. Калі зіма цёплая, можна і ў сябе нарыцца смачнотаў. І ў родным імху можна закапацца па самыя вушы. А ў вярхоўі што там робіцца — не кабанова справа.

— І гэта кажа таварыш уселяснога сходу! — прахрыпеў мядзведзь.

— Дзік мядзведзю на таварыш. Мы — усёедныя.

— Я... я... траваедны! — замахаў адважна вушамі заяц Генік. — Я і з траўкі на кіслае заечае шчаўе якасьці пераб'юся. Толькі не чапайце! — кончыў яшчэ больш ваяўніча, хоць уздрыгнулася заечая губа.

— Вось, а я гэтак за вамі стаяў! — з болем зароў Сандар Жоржавіч. — А дзе вера ў светлае заўтра?! Паразбягаецеся, як толькі мароз у лапы сцісне.

І мароз моцна сціснуў, хоць ужо на вясну ішло, і кожны заняўся ўласным цяпельцам у сваёй футры ці пёрах.

— Наступны сход — праз тыдзень, — сіпла прастагнаў мядзведзь і на чатырох павалокся ў выстуджаную бярлогу.

МакХолад

ISSN 0546-1960